

ЯК ЗАРАБІЦЬ НА ЖНІВЕ **4**

У РЭЙД З ТРАНСПАРТНАЙ ІНСПЕКЦЫЯЙ **11**





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 ЖНІЎНЯ 2018 г. СУБОТА № 153 (28769)


## ЛІЧБА ДНЯ

**На 19,4 %**

*(да $20,2 млрд) павялічыла Беларусь у студзені — чэрвені 2018 года экспарт тавараў і паслуг у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг склаўся ў суме $40,1 млрд, што на 20,7 % больш, чым у студзені — чэрвені 2017 года. Дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі склала $329,4 млн. Знешнегандлёвы абарот тавараў вырас на 21,5 % да $33,6 млрд. Знешнегандлёвы абарот паслуг адзначаны на ўзроўні $6,57 млрд (116,9 % да студзеня — чэрвеня 2017 года).*

# ДЗЕЦЯМ — КЛОПАТ, АГРАРЫЯМ — ТЭХНІКУ

## Прэзідэнт наведаў дзіцячую бальніцу ў Гомелі і «Гомсельмаш»

**Чарговая рабочая паездка кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі адбылася ў Гомель. Падчас яе былі разгледжаны пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Супрацоўнікі «Гомсельмаша» таксама змаглі задаць пытанні Прэзідэнту.**

### Найперш — здароўе

Рэканструкцыя дзіцячай абласной клінічнай бальніцы праходзіла два гады. У выніку колькасць ложкаў павялічана да 552 адзінак. З іншых клінік пераведзены ўсе дзіцячыя аддзяленні хірургічнага і саматычнага профіляў, аддзяленні для нованароджаных і неданошаных дзетак. З'явілася магчымасць арганізаваць работу алергалагічных ложкаў.

**СТАР. 2**



Фота БелТА.



Індывідуальны прадпрымальнік з Лунінца Мікалай ПАШКЕВІЧ наводзіць парадак на агародзе сваёй сядзібы ў вёсцы Кажан-Гарадок, рыхтуе глебу пад будучы — 2019 года — ураджай.

# ЖНІВЕНЬСКАЕ ВОРЫВА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

● Пагадненне пра бязвізавы рэжым паміж Беларуссю і Кітаем учора ўступіла ў сілу. Беларусы могуць знаходзіцца ў Кітаі без візы да 30 дзён у адной паездцы, але не больш за 90 дзён у год.

● **У Беларусі ў ліпені зафіксавана дэфляцыя: індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў ліпені 2018 года ў параўнанні з чэрвенем 2018 года склаў 99,8 %.**

● Еўразійская эканамічная камісія абмяжоўвае колькасць антыбіётыкаў у прадуктах.



● **Беларусы ў ноч з 12 на 13 жніўня змогуць убачыць да 110 падаючых зорак за гадзіну — на гэты час прыпадае пік метэорнага патоку Персеіды.**

● На 103-м кіламетры трасы М6 Мінск — Гродна ў Іўеўскім раёне сутыкнуліся легкавікі «Пежо» і «Рэно». У апошнім былі дзеці двух і пяці гадоў. Цяжкіх наступстваў дапамаглі пазбегнуць аўтакрэслы, у якіх знаходзіліся малыя.

# ГЭТА БЫЛО ФЕЕРЫЧНА!

## Як мінскае «Дынама» разграміла піцерскі «Зеніт»

UEFA EUROPA LEAGUE

**За матчам Лігі Еўропы на сталічным стадыёне назірала больш за 21 тысячу гледачоў, з іх каля дзвюх тысяч — фанаты гасцей. Сталічныя дынамаўцы выйшлі на паядынак 3-га раўнда са знакамітым сапернікам з берагоў Нявы зараджанымі і ўпэўненымі ў сабе. Гэта адбілася на табло ўжо на 12-й хвіліне, лік адкрыў Ураш Нікаліч, стадыён трыумфаваў ад нечаканай радасці. А калі ў сярэдзіне першага тайма перавагу падвоіў Уладзімір Хвашчынскі, трыбуны ўзарваліся яшчэ гучней. Ніна Галавіч пад занавес першай паловы сустрэчы засмуціў піцерцаў яшчэ раз, а кропку ў другім тайме паставіў дубль Ураша Нікаліча — 4:0.**

**СТАР. 13**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

18153>

9 771990 763008

# ДЗЕЦЯМ — КЛОПАТ, АГРАРЫЯМ — ТЭХНІКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт прайшоўся па будынку, наведаў кабінет МРТ, аперацыйныя тэрміновых і планавых аперацый, а таксама неанатальны блок, пагаварыў з супрацоўнікамі бальніцы. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на некаторыя моманты, якія яшчэ трэба дапрацаваць. Першае — даўкамплектаваць бальніцу новым сучасным абсталяваннем, другое — паглядзець на колькасць персаналу, каб яна была аптымальнай для ўстановы.

**Міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА** паведаміў Прэзідэнту асноўныя паказчыкі па лячэнні дзяцей. Напрыклад, адзначыў, што ў апошнія дзесяць гадоў дзіцячая смяротнасць у нас рэзка знізілася. Таксама ён звярнуў увагу на тое, што гэта бальніца стала базай для навучання студэнтаў медуніверсітэта: рыхтуюць свае кадры на месцы.

* * *

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК** расказаў пра асноўныя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, адзначыўшы, што ўсе яны выконваюцца. Таксама губернатар закрануў тэму прамысловасці, гаворачы пра мадэрнізацыю заводаў. Размова зайшла і пра ўборачную кампанію. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на поўначы і на паўднёвым усходзе вобласці стан нездавальняючы. Гэта адбылося не столькі з-за кліматычных умоў, колькі з-за халатных адносін з боку кіраўніцтва. Прэзідэнт звярнуў на гэта ўвагу Уладзіміра Дворніка, адзначыўшы, што неабходна прымусіць усіх працаваць як належыць.

## Чарга за суперкамбайнам

На «Гомсельмашы» Аляксандру Лукашэнку расказалі аб вытворчасці камбайнаў і суперкамбайнаў. Прэзідэнт пацікавіўся, якія праблемы былі выяўлены падчас выпрабаванняў, што неабходна дапрацаваць. Таксама кіраўнік дзяржавы шмат увагі ўдзяліў неабходнасці трымаць узровень канкурэнтаздольнасці, у тым ліку ўлічваючы пэўнае саперніцтва з расійскімі вытворцамі.

**Генеральны дырэктар «Гомсельмаша» Аляксандр КАМКО** адзначыў, што прадпрыемства моцна адчувае канкурэнцыю з Расіяй. Таксама ён расказаў пра імпартазамяшчальны эфект, якога ўдалося дасягнуць, і стратэгію развіцця да 2030 года. Зараз пяць мадэляў камбайнаў праходзяць выпрабаванні і будуць ставіцца на вытворчасць у 2019-м і наступных гадах.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна шукаць варыянты, як працаваць у няроўных умовах і канкурыраваць, не парушаючы тэхналагічны працэс. Неабходна выкарыстоўваць сваю перавагу. Таксама кіраўнік дзяржавы прапанаваў прапрацаваць праграму на ўзроўні ўсёй краіны, якая прадугледжвала б аднаўленне старой тэхнікі. Гэта будзе танней для ўладальніка, чым набываць новую, а для завода такі падыход азначае новы аб'ём працы. З падобным падыходам працуюць МАЗ і МТЗ.


Фота БелТА.

* * *

Пасля наведвання цэха Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з супрацоўнікамі «Гомсельмаша» і адказаў на іх пытанні. Прэзідэнт расказаў, што наведаў прадпрыемства ў тым ліку для таго, каб паглядзець, як ствараецца суперкамбайн, а ў найбліжэйшыя дні плануе паглядзець, як ён працуе ў полі. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што механізатары выказваюцца пра машыну добра, але важна высветліць праблемы. «Вы хочаце мадэрнізавацца. Вы хочаце інвеставаць у вытворчасць. Ёсць крэдыты, але патрэбныя гарантыі, дзяржаўныя, урадавыя. Мы разгледзім гэта пытанне, хутчэй за ўсё, мы вас падтрымаем, але пад пэўныя абавязацельствы, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Асноўная мэта майго візіту — я не магу дапусціць, каб «Гомсельмаш» пры такой жорсткай канкурэнцыі, прытым нядобрасумленнай канкурэнцыі, знік з карты нашай планеты. Вядома, мы гэтага не дапусцім».

Наконт саперніцтва ў вытворчасці Аляксандр Лукашэнка выказаўся, што і з захаду, і з усходу мы заціснуты. Прэзідэнт звярнуў увагу на падтрымку расійскага вытворцы, нягледзячы на дамоўленасці ў межах Еўразійскага эканамічнага саюза. «Гэта няправільна. Гэта несправядліва. І гэту праблему мы не здымаем з парадку дня беларуска-расійскіх перагавораў на ўзроўні ўрада і нават Прэзідэнта. Таму мы будзем імкнуцца, каб стварыць роўныя канкурэнтныя ўмовы».

Кіраўнік дзяржавы назваў Казахстан вельмі важным рынкам, які гатовы з намі супрацоўнічаць і ўвайсці ў капітал прадпрыемства. Прэзідэнт падкрэсліў, што не збіраецца «Гомсельмаш» прадаваць. Казахстанскі бок можа разлічваць толькі на пэўную долю акцый.

«Але самае галоўнае датычыцца вас, і я вам адкрыта ў вочы кажу: калі вы не падцягнецеся з якасцю сваёй тэхнікі, вы будзеце неканкурэнтаздольныя. І я вас тады падтрымліваць не буду», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы. Якасць прадукцыі — пытанне нумар адзін.

## Ад футбола да агарода

Супрацоўнікі прадпрыемства задалі тры пытанні Прэзідэнту: пра рэканструкцыю бальніцы, Еўрапейскія гульні і пра яго ўласны прысядзібны ўчастак.

«Пабудавалі палац», — такім уражаннем наконт бальніцы падзяліўся кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы найвышэйшыя тэхналогіі. «Экалогія пагаршаецца, і дзеці не ўсе нараджаюцца цалкам здаровымі. І вось такія палацы, такія цэнтры ў кожнай вобласці створаны. Неабходна было стварыць у Гомелі», — рэзюмаваў Прэзідэнт. На яго думку, атрымаўся выдатны квартал з унутраным дворыкам. Бальніцы хапае для дзетак вобласці, і ёсць яшчэ запас.

Пра свой прысядзібны ўчастак Аляксандр Лукашэнка расказаў, што стараецца вырошчваць там навінкі. Сёлета пасадзіў пяць сартоў бульбы і застаўся задаволены. Дакладна гэтаксама Прэзідэнт эксперыментуе з кармавымі культурамі, ужо ідзе чацвёрты ўкос.

Кіраўнік дзяржавы зноў закрануў тэму абнаўлення Оршы, а таксама іншых падобных гарадоў у краіне, напрыклад Барысава, Жлобіна, Мазыра, Ліды, Бабруйска, Баранавічаў.

Намеснік старшыні прафкама прадпрыемства пацікавіўся, якія ўражанні ў Прэзідэнта ад гульні «Дынама-Мінск» — «Зеніт» на сталічным стадыёне. Аляксандр Лукашэнка адказаў, што ўжо падзякаваў камандзе і трэнеру: «Яны падарылі свята ўсёй краіне. Малайцы». Наконт другіх Еўрапейскіх гульняў Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што гэта саперніцтва нас падагнала зрабіць добрую спартыўную інфраструктуру. Гэта станоўча адаб'ецца на турыстычнай галіне і на іміджы краіны.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## Каментарый у тэму

**Намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Аляксандр ДЗЯЖУРКА:**

— Самае важнае — што мы атрымалі сучасны дзіцячы медыцынскі цэнтр, які адсутнічаў у вобласці. І мы закупілі самае сучаснае абсталяванне, якое ўжо ўстаноўлена, працуе, праведзены першыя аперацыі. У нас з'явілася камп'ютарная тамаграфія, МРТ, эндаскапічнае абсталяванне, сучасныя хірургічныя сталы і відэастойкі. Усё гэта дазволіць падняць на больш высокі ўзровень медыцынскую дапамогу дзецям рэгіёна. Акрамя таго, гэтыя магчымасці пашырыліся. Мы будзем аказваць медыцынскую дапамогу дзецям да 18 гадоў, чаго раней не было.

Дагэтуль дапамога аказвалася дзецям на дастаткова высокім узроўні, але па некаторых праблемах прыходзілася накіроўваць малых пацыентаў у рэспубліканскія медыцынскія цэнтры. Зараз пералік аперацый і дыягнастычных магчымасцяў пашыраецца на месцы, павысілася даступнасць.

Мы прадбачылі пашырэнне нашай бальніцы і працавалі з наборам кадраў. Хтосьці прыйшоў як малады спецыяліст, хтосьці — з іншых медустаноў, і колькасць персаналу павялічылася практычна ўдвая. На дадзены момант у нас 160 урачоў і прыкладна 1200 пасад работнікаў. Працягваецца набор персаналу.

Мы займаліся пытаннем экспарту паслуг. І вядома, магчымасці нашы значна пашыраюцца ў гэтым напрамку. Мы будзем супрацоўнічаць з прыгранічнымі, перш за ўсё, абласцямі.

**Намеснік старшыні прафсаюзнага камітэта «Гомсельмаша» Іван ШВЕД:**

— Я заўсёды сачу за спартыўнымі мерапрыемствамі. Гэта прыносіць задавальненне, як ад футбольнага матча ў чацвер і выступлення нашых спартсменаў на чэмпіянаце Еўропы. Хацелася асабіста пачуць меркаванне Прэзідэнта. Тое, што ствараецца для спорту, павінна апраўдваць сябе.

Наконт вытворчасці самае галоўнае пытанне — тое, што ўсё ж такі нам часта пастаўляюць няякасныя камплектуючыя сумежныя пастаўшчыкі. Гэта не сакрэт. Але, як Прэзідэнт гаворыць, нецікава, хто паставіў прадукцыю з бракам. Гэта наш камбайн, і мы за яго нясём поўную адказнасць. Ён павінен быць працаздольным, а для гэтага кожны работнік на сваім рабочым месцы павінен добрасумленна выконваць свае працоўныя абавязкі, кантраляваць тое, што пастаўляецца. І ў выпадку адхіленняў інфармаваць бюро тэхнічнага кантролю і вяртаць гэтую прадукцыю. Над гэтым мы працуем. Мы вельмі шмат зрабілі ў пытанні імпартазамяшчэння, каб гэтыя рэчы выключаць.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## НАЗВАНЫЯ КРАІНЫ, НАЙБОЛЬШ СХІЛЬНЫЯ ДА «ДЭМАГРАФІЧНЫХ БОМБАЎ»



Выданне Science Alert назвала еўрапейскія, азіяцкія і іншыя краіны свету, найбольш схільныя да «дэмаграфічных бомбаў запаволенага дзеяння» з-за зніжэння нараджальнасці і павелічэння долі пажылых людзей. Да іх адносяцца ЗША, Іспанія, Італія, Паўднёвая Карэя, а таксама Японія і Кітай. Як вядома, «дэмаграфічнай бомбай запаволенага дзеяння» называюць сітуацыю, калі назіраецца памяншэнне долі працаздольнага насельніцтва. Каб гэтага пазбегнуць, на адну жанчыну павінна ў сярэднім прыпадаць больш чым два дзіцяці. Аднак каэфіцыент нараджальнасці ў многіх развітых краінах упаў ніжэй за гэты ўзровень. Наступствы могуць быць змікшыраваныя прытокам рабочых-мігрантаў, аднак гэтымі мерамі нельга спыніць крызіс цалкам, калі значная колькасць грамадзян з'язджае на працу ў іншыя краіны. Паведамляецца, што ў ЗША каэфіцыент нараджальнасці знізіўся да рэкорднага мінімуму ў 1,76, а чаканая сярэдняя працягласць жыцця дасягнула 78,7 года. У Іспаніі каэфіцыент нараджальнасці складае 1,5, а смяротнасць перавышае нараджальнасць. Павелічэнне насельніцтва адбываецца толькі за кошт прыезджых, а некаторыя паселішчы ўжо амаль цалкам вымерлі. Падобныя тэндэнцыі назіраюцца і ў Італіі, дзе людзі адмаўляюцца ад вялікай колькасці дзяцей з-за фінансавых цяжкасцяў. У Японіі каэфіцыент дасягае 1,44, а ў Паўднёвай Карэі — 1,26. У Кітаі сем'ям дазволена мець двух дзяцей замест аднаго, аднак нават з улікам гэтага да 2030 года ўзрост чвэрці насельніцтва дасягне 60 гадоў (у 2010-м паказчык складаў 13 працэнтаў).

## У РАСІІ ВЫЯВІЛІ ПАХАВАННЕ, СТАРЭЙШАЕ ЗА ЕГІПЕЦКІЯ ПІРАМІДЫ

У зоне будучага будаўніцтва аўтадарогі ў горадзе Аксай у Растоўскай вобласці археолагі выявілі найстаражытнейшае пахаванне. Паводле ацэнак спецыялістаў, яго можна аднесці да IV тысячагоддзя да нашай эры, перадае РІА Навіны. «Шэсць тысяч гадоў таму назад, за тысячу гадоў да першых егіпецкіх пірамід! Гэта ўнікальныя знаходкі, якія можна назваць сапраўднай навуковай сенсацыяй», — адзначаецца ў паведамленні кампаніі «Аўтадар», якая выступіла заказчыкам пошукаў. Падчас раскопак археолагі наткнуліся на арыгінальныя каменныя канструкцыі ў выглядзе падземных камер-катакомбаў. Адзначаецца, што ў гэтых камерах у добрым стане захаваліся посуд, які традыцыйна выкарыстоўваўся для памінальнай ежы, элементы конскіх аброццяў, а таксама медныя прылады. На думку навукоўцаў, ужо першыя вынікі раскопак сведчаць аб унікальным характары гэтага аб'екта культурнай спадчыны.

## У БАЯВЫХ ЧАСЦЯХ ІЗРАІЛЬСКАЙ АРМІІ БУДЗЕ СЛУЖЫЦЬ РЭКОРДНАЯ КОЛЬКАСЦЬ ДЗЯЎЧАТ



Жаданне служыць у баявых часцях Арміі абароны Ізраіля (ЦАХАЛ) выказалі 1000 дзяўчат-прызыўніц — рэкордная колькасць у параўнанні з мінулымі гадамі, паведамляе вайсковая радыёстанцыя «Галей ЦАХАЛ» па выніках новага вайсковага прызыву, які завяршыўся на гэтым тыдні. Адзначаецца, што яшчэ пяць гадоў таму такіх добраахвотніц сярод дзяўчат было ўдвая менш. Паведамляецца таксама і аб павелічэнні колькасці прызыўніц, якія пажадалі служыць у баявых часцях, сярод рэлігійных дзяўчат. Акрамя карэнных ізраільцян, да ЦАХАЛ далучыліся маладыя рэпатрыянты, якія прыбылі з розных краін Еўропы, Лацінскай Амерыкі, Афрыкі. Частка з іх залічана ў інжынерны корпус, рэпатрыянты таксама будуць служыць у брыгадзе парашутыстаў-дэсантнікаў, бранятанкавым і артылерыйскім карпусах, батальёнах ратавальнікаў і проціпаветранай абароны.

■ Занятасць

# ПАЛОВЕ АЙЦІШНІКАЎ — ДА 31 ГОДА

## Дзе працуе беларуская моладзь

**Удзельная вага моладзі сярод працуючых складае 22,6 %. Асноўная доля занята ў крэатыўнай індустрыі. Самы маладзёжны від эканамічнай дзейнасці — інфармацыйныя тэхналогіі (51,4 % работнікаў гэтай галіны — да 31 года). У сферы паслуг па часовым пражыванні і харчаванні маладыя людзі складаюць 38,8 % ад агульнай колькасці работнікаў, інфармацыі і сувязі — 38,1 %, аптовым і рознічным гандлі, рамонце аўто — 31 %, фінансавай і страхавой дзейнасці — 27,5 %.**

— Доля грамадзян ва ўзросце да 31 года сярод кіраўнікоў — каля 6 %, сярод спецыялістаў — 42 %, — канстатуе **кансультант упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Жанна ШЧАМЯЛЁВА.**

Колькасць моладзі сярод зарэгістраваных беспрацоўных штогод скарачаецца — такая тэндэнцыя звязана з дэмаграфічнай сітуацыяй. На сёння доля гэтай катэгорыі сярод незанятых беларусаў — 28,5 %. Для параўнання: у 2000 годзе паказчык быў роўны 52 %, у 2015-м — амаль 34 %.

У адпаведнасці з заканадаўствам, моладзь, якая ўпершыню выходзіць на рынак працы, адносіцца да сацыяльна ўразлівай катэгорыі, таму для яе прадугледжаны дадатковыя гарантыі занятасці. Напрыклад, браніраванне рабочых месцаў — на гэты год іх «зарэзервавалі» для 3795 чалавек. Такая бронь устанаўліваецца практычна ўсім прадпрыемствам у раёне. За неабгрунтаваны адказ юнаму работніку — штрафныя санкцыі.

Набрацца працоўнага вопыту моладзь можа ў студатрадах. Сёлета ў Беларусі было сфарміравана 884 атрады па сямі профілях дзейнасці: будаўнічым, сельскагаспадарчым, педагагічным, сэрвісным, экалагічным, медыцынскім і вытворчым. Узрост байцоў — ад 14 да 21 года. На 1 жніўня ў складзе студэнцкіх атрадаў адпрацавала 10,5 тысячы чалавек. Індывідуальна ўладкаваны на работу былі больш за тысячу чалавек.

— Каля 500 байцоў працуе ў Расіі — гэта будаўнічыя, педагагічныя і сэрвісныя атрады, — расказвае пра міжнароднае супрацоўніцтва **другі сакратар ЦК БРСМ Алег ДЗІКУН.** — Упершыню ў нас з'явіўся атрад у Малдове: 31 чалавек выехаў на ўборку ўраджаю. Збіралі персікі, цяпер узяліся за вінаград. Хлопцы і дзяўчаты вельмі задаволеныя. Спадзяюся, гэты кірунак для нас будзе развівацца, і налета туды паедзе 100—200 чалавек. Таксама будзем адпрацоўваць у наступным годзе такі кірунак, як Узбекістан.

Заробкі розныя. Самыя высокія — у будаўнічых атрадах: да 1500 рублёў у месяц. Байцы на атамнай электрастанцыі ў Астраўцы атрымліваюць у сярэднім 700 рублёў. Сярэдні заробак у сельскагаспадарчых атрадах — 300 рублёў, у педагагічных — 200—350. Моладзь, якая шчыруе ў Малдове, можа разлічваць на тысячу рублёў.

У лагерах працы і адпачынку пабывалі 13,3 тысячы школьнікаў. Навучэнцы займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі, фарбаваннем, рамонтам кабінетаў, праполваннем, пабелам дрэў, пашывам спецадзення і бялізны, вырабам сувеніраў. Сярэднія заробкі дзяцей складаюць ад 80 да 220 рублёў у залежнасці ад колькасці працоўных дзён і формы арганізацыі лагера.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■

# «УМЕЮ БЕГАЦЬ ПАД ДАЖДЖОМ»

## Эльвіра Герман стала чэмпіёнкай Еўропы ў бегу на 100 м з бар'ерамі

**У фінале кантынентальнага форуму ў Берліне беларуска паказала вынік 12,67 сек, у фінішным створы апярэдзіўшы дзвюх саперніц з Германіі. Памэла Дуткевіч заняла другое месца — 12,72 сек, Сіндзі Роледэр стала бронзавым прызёрам — 12,77 сек.**



З поспехам беларускую спартсменку павіншаваў Прэзідэнт. «Гэтая выдатная перамога ў саперніцтве з атлетамі сусветнага ўзроўню прынесла шмат станоўчых эмоцый беларускім балельшчыкам», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы перакананы, што дзякуючы працавітасці, мэтанакіраванасці, цудоўнай тэхнічнай падрыхтоўцы Эльвіра Герман працягне паспяховае станаўленне ў дарослым спорце, пакараючы вышэйшыя прыступкі п'едэсталаў найбуйнейшых спаборніцтваў. Аляксандр Лукашэнка пажадаў усёй беларускай камандзе моцнага здароўя і новых перамог.

«Падчас выхаду на старт хацела толькі залаты медаль, — адзначае Эльвіра. — На старце сказала сабе: залаты або ніякі. Калі ўсё атрымалася, абрынуўся шквал эмоцый. Побач са мной бегла Памэла Дуткевіч з Германіі, баялася, што яна плячом можа ўлезці першай на фінішы, але гэтага не здарылася. Да гэтага чэмпіянату разам з трэнерам Віктарам Мясніковым прарабілі вялікі аб'ём работы, я ўжо стабільна бегала ў раёне 12,60—12,80 сек. У Берліне паказала свой вынік, хоць перад пачаткам чэмпіянату адчувала праблемы са здароўем. Калі выйшла на старт, пачаўся невялікі дождж, і я падумала пра тое, што гэта добры знак, бо ўмею бегаць пад дажджом».

Нагадаем, у 2016 годзе Эльвіра Герман заваявала залаты медаль маладзёжнага чэмпіянату свету.

Адзначым, што ў фінальным забегу ў Берліне выступіла і Аліна Талай, якая не змагла фінішаваць, дапусціўшы памылку на бар'еры.

Залатая ўзнагарода Герман стала чацвёртай у скарбонцы беларускай каманды на чэмпіянаце Еўропы ў Берліне. Раней бронзавымі прызёрамі сталі Дзмітрый Дзюбін у хадзе на 50 км, у штурханні ядра — Алена Дубіцкая і дзесяцібарэц Віталь Жук. Дзякуючы «золату» Герман Беларусь перамясцілася на шостае месца ў медальным заліку.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■

■ Сезон

## Адкрываецца паляванне на птушак

**З другой суботы жніўня (сёлета гэта 11-е чысло) можна будзе паляваць на вадаплаўную і балотную дзічыну (акрамя гусей), а таксама — слонку, вяхіра, шызага голуба, перапёлку і фазана.**

Паляванне дазволена ў светлы час сутак спосабамі — з засады, з падыходу, з пад'езду з выкарыстаннем маламерных суднаў (без рухавікоў або з выключанымі рухавікамі). Дазваляецца выкарыстанне гладкаствольнай паляўнічай зброі і патронаў са шротам, прымяненне паляўнічых сабак усіх груп, акрамя ганчакоў і хартоў. Дапускаецца безружэйнае паляванне з лоўчымі птушкамі.

Як нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, адпраўляючыся ва ўгоддзі, паляўнічы павінен мець пры сабе наступныя дакументы: сапраўднае дзяржпасведчанне на права палявання (з адзнакай аб выплаце дзяржпошліны або квітанцыю аб яе выплаце), паляўнічую пуцёўку, дазвол на нашэнне зброі, рэгістрацыйныя дакументы на паляўнічых сабак або лоўчых птушак.

З 1 верасня будзе дазволена здабываць рабчыка і шэрую курапатку, а з 15 верасня — гусей: белалобую, гуменніка, шэрую і канадскую казарку. Працягнецца летне-асенні сезон палявання на птушыную дзічыну да 9 снежня.

## Лясы зноў закрываюцца для грыбнікоў

**Забарона на наведванне лясоў уведзена ў 13 раёнах Гомельскай вобласці. Пра гэта паведамілі ў Гомельскім дзяржаўным вытворчым лесагаспадарчым аб'яднанні.**

Па даных на раніцу 10 жніўня, лясныя масівы для наведванняў закрыліся ў Акцябрскім, Буда-Кашалёўскім, Брагінскім, Кармянскім, Чачэрскім, Калінкавіцкім, Мазырскім, Хойніцкім, Добрушскім, Гомельскім, Ельскім, Лоеўскім і Рэчыцкім раёнах. У лясах уведзены чацвёрты клас пажарнай небяспекі з магчымых пяці.

Дажджоў у некаторых раёнах вобласці не было ўжо больш за два тыдні. У лясах кропкава фіксуюцца ўзгаранні, якія аператыўна ліквідуюцца. Аднак па прычыне сухога гарачага надвор'я сітуацыя штодня ўскладняецца.

Пра тое, што ў лясах уведзена забарона на наведванне, інфармуюць спецыяльныя аб'явы, таблічкі, паведамленні, у тым ліку ў СМІ і на сайтах дзяржорганаў. Уезды ў лясныя масіў закрываюцца шлагбаумамі. Для папярэджання лясных пажараў, выяўлення парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства работнікі лясгасаў праводзяць штодзённыя рэйды. Сачыць за становішчам дапамагаюць і фотапасткі. Парушэнне правілаў пажарнай бяспекі можа пагражаць штрафам да 25 базавых велічынь (цяпер 1 БВ складае Br24,5).

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# ЗАПЛАЦІ... І ЖЫВІ СПАКОЙНА

**Як паведаміў Камітэт дзяржкантролю, дзве мінскія фірмы недаплацілі 5,6 мільёна рублёў падаткаў з-за таго, што афармлялі фіктыўныя здзелкі.**

Работнікі Бабруйскага міжраённага аддзела ўпраўлення ДФР Камітэта дзяржкантролю па Магілёўскай вобласці выявілі, што ў 2011—2015 гадах нячысты на руку камерсанты стварылі брытанскі суб'ект гаспадарання, каб ухіліцца ад выплаты падаткаў на тэрыторыі Беларусі. Мусіць, каб лепей замесці сляды, кіравалі яны гэтай кампаніяй-нерэзідэнтам па інтэрнэце. І з чыстым сэрцам заключалі фіктыўныя здзелкі па набыцці ў падкантрольнай ім брытанскай фірмы імпартных электронных кампанентаў па завышаных цэнах. Фактычна ж тавар набываўся непасрэдна ў замежнага вытворцы па больш нізкай цане.

Судом Фрунзенскага раёна горада Мінска разгледжана крымінальная справа ў дачыненні да трох кіраўнікоў дзвюх сталічных фірмаў па фактах ухілення ад выплаты падаткаў і збораў у суме 5,6 мільёна рублёў. На лаве падсудных апынуліся дырэктар ТАА «ФІК» (ён жа займаў пасаду намесніка дырэктара ТАА «БЭК-эксперт») і два яго намеснікі. У ходзе папярэдняга расследавання ў бюджэт кампенсавана 330 тысяч рублёў з агульнай сумы нанесенай шкоды.

За нявыплату падаткаў у асабліва буйным памеры дырэктар прысуджаны да пазбаўлення волі на пяць гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Два намеснікі дырэктара — на чатыры гады з канфіскацыяй маёмасці. Усе трое пазбаўлены права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых і адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў, на тэрмін пяць гадоў.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

## У Малінаўку, Паўднёвы Захад і Сухарава пусцяць электрааўтобусы

Адбудзецца гэта ў 2019 годзе, калі пабудуюць новыя пасты для падзарадкі аўтобусаў. У адпаведнасці з інвестыцыйнай праграмай Мінска, адзін з пастоў для падзарадкі транспартных сродкаў будзе знаходзіцца на развваротным кальцы «Малінаўка», другі — на развваротным кальцы «Паўднёвы Захад» і трэці — на развваротным кальцы «Сухарава-5». Сёлета і ў 2019 годзе плануецца закупка 60 электрааўтобусаў «Белкамунмаш», якія выйдуць на лінію да мая.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

■ Сугучча

# КНІЖНЫЯ СТАСУНКІ ПАШЫРАЮЦЦА

**У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь прайшло пасяджэнне беларускай часткі каардынацыйнай групы па рэалізацыі «Праекта перакладу і публікацыі класічных літаратурных твораў Кітая і Беларусі».**

Нагодай для шырокай размовы стала падрыхтоўка да ўдзелу беларускай дэлегацыі ў Міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы Beijing International Book Fair (BIBF 2018), якая пройдзе ў жніўні ў Пекіне. Міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч адзначыў, што ў апошнія некалькі гадоў у Беларусі дастаткова актыўна наладжаны адносіны беларускай мастацкай літаратуры Кітая на беларускую мову з пісьменнікамі і выдаўцамі Кітая. Як вынік — плённая дзейнасць выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Выдавецкага дома «Звязда». У адной толькі серыі кніг «Светлыя знакі: паэты Кітая» пабачылі свет дванаццаць паэтычных зборнікаў, палова з якіх — адразу на дзвюх мовах: беларускай і кітайскай. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» пайшло далей за іншыя выдавецкія структуры, наладзіўшы партнёрскія адносіны з кітайскім бокам як фундатарам цэлага шэрагу кніжных праектаў. У верасні 2019 года мяркуецца адкрыццё адмысловых «кітайскіх паліц» у адной з мінскіх кнігарань «Белкнігі». З пэўнымі ідэямі да ўдзелу ў міжнароднай выстаўцы ў Пекін выпраўляецца і рэдакцыя часопіса «Вясёлка». Пра гэтыя і іншыя планы ішла размова на пасяджэнні беларускай часткі каардынацыйнай групы па рэалізацыі «Праекта перакладу і публікацыі класічных літаратурных твораў Кітая і Беларусі».

У час паездкі ў Кітай ад імя Міністэрства інфармацыі Цэнтру культуры Беларусі ў Другім Пекінскім універсітэце замежных моў будзе перададзена бібліятэка сучаснай беларускай літаратуры.

**Сяргей ШЫЧКО**

■

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск» (210026, г. Витебск, ул. Суворова,16) сообщает о том, что 9 августа 2018 года на внеочередном общем собрании акционеров принято решение о выплате дивидендов за 1 полугодие 2018 года. Сумма дивидендов за 1 полугодие 2018 года составляет 56 415,69 рубля. Размер начисленных дивидендов на одну простую (обыкновенную) акцию составляет 0,012604467 рубля.

Дивиденды юридическому лицу выплачиваются путем перечисления на текущий (расчетный) счет до 22 августа 2018 года, физическим лицам выплачивается согласно пункту 7.2. протокола № 61 годового общего собрания акционеров от 28 марта 2018 года.

УНП 300000398

# «ЗБІРАЮ НА МАШЫНУ»

## Як студэнты і будаўнікі зарабляюць на жніве

**Юрый Неўмывака працуе ў баранавіцкім будтрэсце. Вось ужо 10 гадоў свой водпуск летам праводзіць у Клецкім раёне. Не адпачывае — зарабляе на ўборачнай. Ідзе памочнікам да швагра, які працуе камбайнерам у гаспадарцы. «Як той казаў, у іншым месцы адпачываць будзем», — па-філасофску заўважае мужчына, жмурачыся на сонцы. Пра тое, колькі грошай можна атрымаць на жніве і хто праводзіць лета не на моры, а ў полі, — у рэпартажы «Звязды».**



Дырэктар гаспадаркі «Кухчыцы» Сяргей ЗДРОК *(на фота)* сустракае нас на джыпе. «На такой машыне зручна па палях ездзіць», — усміхаецца. Раней, успамінае ён, на сезон набіралі нават камбайнераў — не хапала работнікаў. За апошнія гады ў гаспадарку шмат людзей уладкавалася, таму абыходзяцца практычна сваімі сіламі.

— Але я даю магчымасць зарабіць усім. Старшакласнікі ў нас былі — праполвалі буракі, збожжавыя, на ўборачнай падграбалі. Студэнт на лета прыйшоў папрацаваць — возіць галоўнага заатэхніка. Жанчыны заняты на зерняскладзе — напрыклад, загадваюць токам, стаяць на вагах. А каб стаць памочнікам камбайнера, абавязкова

**За мінулы месяц сярэдні заробак у «Кухчыцах» склаў 855 рублёў. Але можна мець і больш. Сяргей Здрок прыгадвае, як адзін з мужчын на ўборцы буракоў толькі за перапрацоўку атрымаў даплату ў 1100 рублёў.**

трэба мець пасведчанне кіроўцы і жаданне працаваць.

Працаваць у гаспадарцы падчас жніва даводзіцца ад ранку да самага вечара.



Студэнт Яўген АНІКЕЙ працуе ў пары з дзядзькам.

Юрый Неўмывака кажа, што калі якая паломка камбайна здарылася, прыязджае на работу і а шостай, і а пятай раніцы, каб паспець падрыхтаваць тэхніку і выйсці ў поле без спазнення. Закончыцца працоўны дзень можа ў 11 вечара.

— Зарабіць удаецца паразнаму — як намалоціш, так і заплацяць. Памятаю, неяк за водпуск каля 18 мільёнаў на старыя грошы атрымаў. Гэта больш, чым мой заробак на асноўным месцы працы. Трачу ўсё на жонку і дваіх дзяцей, а на каго яшчэ? Для сябе хапае — на рабоце кормяць і адзяваюць. Збіраю толькі на кватэру. Калі чарга прыйдзе, пабудуемся.

Работнікаў на полі забяспечваюць гарачымі абедамі. Сабекошт порцыі — чатыры рублі, але з заробкаў вылічваюць толькі 10 працэнтаў ад гэтай сумы.

— За 40 капеек ні адна жонка мужыка не пакорміць, — жартуе Сяргей Здрок. — Мне казалі, што гэта страты. Я падлічыў: накарміць усю гаспадарку ў дзень каштуе 250 рублёў. А калі супрацоўнікі будуць самі дадому ездзіць абедаць, прастой за гэты час абыдзецца ў 350 рублёў. Так што я ў плюсе застаюся.



Юрый НЕЎМЫВАКА ўжо 10 гадоў праводзіць водпуск на ўборачнай.

Штрафныя меры тут, дарэчы, сур'ёзныя. Прагуляў, з'явіўся ў п'яным выглядзе ці без спецдзення — мінус 100 працэнтаў КПУ (каэфіцыенту працоўнага ўдзелу). Раней пазбаўлялі толькі 10 працэнтаў, але вырашылі, што больш строгі падыход прымусіць людзей адказна ставіцца да працы.

...На полі разгаварыліся з Юрыем Шылам з аграгарадка Зубкі. У памочнікі яго паклікаў саслужывец-камбайнер. «Цяжкавата», — прызнаецца Юрый. Ён часова беспрацоўны. На будаўнічай фірме, дзе мужчына быў уладкаваны, адбылося скарачэнне, а знайсці добрааплатную вакансію па спецыяльнасці («каб рублёў 700 у месяц мець») у раёне складана. Таму падпрацоўка на жніве для вяскоўца — сапраўдная ўдача.

— Дома рамонт трэба зрабіць, ужо крэдыт узяў. Што пасля ўборачнай? На папярэдняй фірме быццам усё наладзілася, буду спадзявацца, возьмуць. Калі што, ёсць пасведчанне кіроўцы — можна дальнабойшчыкам пайсці. Няпростая прафесія, але аплатная, — разважае Юрый.

На лета ў гаспадарку ўладкаваўся і студэнт Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта Яўген Анікей. Працуе на камбайне ў пары з дзядзькам.

— Не цяжка, ужо прывык. Адпачыць я і падчас вучобы паспею, а зараз трэба крыху грошай зарабіць. Сёлета на машыну збіраю: старую прадаў, а на новую яшчэ не хапае, — дзеліцца планамі прадпрымальны студэнт.

Яўген мясцовы, з Кухчыц. У тэхніцы, лічы, з маленства добра разбіраецца — жывучы на вёсцы, трэба ўмець усё. На жніве хлопец праводзіць трэці год. А вось наступны сезон будзе ўжо без яго — будучага інструктара-метадыста па аздараўленчай фізкультуры чакае размеркаванне.

Памочнікам з ліку моладзі Сяргей Здрок заўсёды рады. «Хлопцы гатовы шчыраваць без выходных, а для мужчын ва ўзросце гэта стымул старацца, каб паспяваць за імі. Тых, хто рвецца папрацаваць, я не магу не ўзяць. Моладзь трэба падтрымаць, няхай адчуюць гэты хлеб. Сам так пачынаў».

Дырэктар гаспадаркі расказвае, што яго 14-гадовы сын таксама хоча звязаць жыццё з працай на зямлі. І не толькі ён.

— Дачка, ёй цяпер 11, сказала: «Эканамістам пайду». Пытаюся: «Куды, можа, у горад?». «Не, — гаворыць, — толькі ў гаспадарку». Яна летась прыехала на поле, узяла зводку па ўраджаі, праставіла месцы. І кожны дзень адсочвала. Разам з сяброўкамі сядзелі і высвятлялі, чый тата справіцца найлепш. Летась наша прадпрыемства стала першым у раёне па ўраджайнасці збожжавых. Дачка на гэта: «У цэлым мы нядрэнна глядзімся. А па рапсе трэба падцягнуцца — мы на другім месцы».

За мінулы месяц сярэдні заробак у «Кухчыцах» склаў 855 рублёў. Але можна мець і больш. Сяргей Здрок прыгадвае, як адзін з мужчын на ўборцы буракоў толькі за перапрацоўку атрымаў даплату ў 1100 рублёў. І дадае, што некаторыя перадавікі могуць зарабляць лепш, чым ён, кіраўнік. Так што ёсць стымул старацца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ,**
*Клецкі раён.*

### ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

**На перыяд уборачнай кампаніі ў іншыя сельскагаспадарчыя арганізацыі Клецкага раёна было ўладкавана 30 работнікаў. 14 з іх працавалі на камбайнах, 16 — на зернесушыльных комплексах. Прыцягваліся людзі з МНС, школ, ЖКГ, аддзелаў адукацыі і культуры выканкама, Клецкага прадпрыемства меліярацыйных сістэм.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Юрыя ШЫЛУ ў памочнікі паклікаў саслужывец-камбайнер.


**ОАО «ЦентроСтройОфис» (г. Минск, ул. Монтажников, 39-208) проводит внеочередное общее собрание акционеров ОАО «ЦентроСтройОфис» в очной форме 22 августа 2018 года в 10.00. Место проведения собрания: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.**

**Повестка дня собрания:**
О сделках общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться в день проведения собрания с 09.00 до 09.45 по адресу: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

Участники собрания должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (представители акционера – документ, удостоверяющий личность, и доверенность).

Дата составления списка владельцев ценных бумаг для регистрации участников собрания по состоянию реестра акционеров на 17.08.2018 г.

Время и место ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании, с материалами по вопросам повестки дня общего собрания: с 9.00 до 9.30, в рабочие дни с 13.08.2018 г. по 22.08.2018 г. по адресу: ОАО «ЦентроСтройОфис», г. Минск, ул. Монтажников, 39, к. 208.

УНП 191303207



**Извещение о проведении 24 августа 2018 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (состав и сведения о продаваемом имуществе)** | «Литер А 2/К. Здание административно-хозяйственное (Бытовой комплекс)» общей площадью 629,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21714; «Литер Б 1/К. Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель (Столярный цех)» общей площадью 2 528,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21715; «Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, литер Е 1/к» общей площадью 113,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21719; «Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, литер Ж 1/к» общей площадью 185,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21718; Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, литер В 1/к общей площадью 139,0 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 500/С-21716; распределительный шкаф СПМ (инв. № 40020А); распределительный шкаф СПМ (инв. № 40025); распределительный шкаф СПМ (инв. № 40027); вводный распределительный щит (инв. № 40028); вводный распределительный щит (инв. № 40030); вводный распределительный щит (инв. № 40031); шлагбаум WILL (инв. № 1877); оборудование котельной (инв. №10002ЦО); забор кирпичный с ж/б эл-ми и сетки-рабицы (инв. № 44); производственная площадка с асфальтовым покрытием (инв. № 37); сети водопроводные стальные (инв. № 857); канализационные сети чугунные (инв. № 859); навес над гильотиной (собственное произв-во) (инв. № 21776); газопровод среднего давления к котельной (инв. № 42109); беседка (инв. № 1668). |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Пинская, 28, 28/1, 28/2, 28/3, 28/4. |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер – 500000000006000665, площадь – 0,9377 га |
| **Продавец имущества** | ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 2 253 072,69 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 225 000,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

При заключении договора купли-продажи недвижимого имущества ОАО «Минскремстрой» руководствуется своими имущественными интересами, уставом, локальными нормативными правовыми актами Общества, подходами по распоряжению государственным имуществом согласно Указу Президента Республики Беларусь от 4 июля 2012 г. № 294 «О порядке распоряжения государственным имуществом» и другими нормативными правовыми актами Республики Беларусь.

Торги проводятся 24 августа 2018 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 14.08.2018 по 22.08.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»).



■ Вандроўкі з сяброўкай

# АДАСОБЛЕНЫ РЭЛАКС

## Мінус 190 °С, уласнае «сонца» і іншыя цікавінкі санаторыя на Нарачы

**Сасновы абсяг з магутнымі дрэвамі, акуратныя сцежкі між дамкамі для адпачывальнікаў — сапраўднымі двухпавярховымі катэджамі. Паабапал галоўнага корпуса — альпійскія горкі незвычайных формаў з кветкамі і хвоямі, вялікі фантан, алея з ажурнымі ліхтарамі ды лаўкамі. А ўнутры збудавання — шкляная і светлавая прыгажосць аздаблення, смачная ежа, безліч працэдур... А яшчэ... кожны з табой вітаецца, ну не раўнуючы як на вёсцы, дзе ўсе адно аднаго ведаюць. Усё гэта — санаторый «Сосны» ў Нарачанскім парку — больш за 55 гектараў прыроднай прыгажосці, цішыні і душэўнасці, якую, як кажуць, так цэняць госці.**

### Душ уражанняў і эмоцый

Налюбаваўшыся прыроднай веліччу, разам з **Валерыяй НІКІЦЮК, спецыялістам аддзела інфармацыі турапэратара «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму»**, вырашылі выпрабаваць на сабе мясцовыя прапановы. Ахапіць усе, ды яшчэ за адзін дзень, вядома, немагчыма, таму выбралі самыя выбітныя.

Напачатку трапілі ў крыякамеру, дзе я спаўна адчула, што такое лячэнне холадам мінус 130 °С. Гэта на першы раз, бо некаторыя адпачывальнікі даходзяць да максімуму — 190 °С. Арганізм за хвіліну нават не паспеў зразумець, што адбылося, а ўжо выскачыў з капсулы і, здаецца, палягчэў на пару кілаграмаў і ўзбадзёрыўся вышэй нормы.

Яшчэ я пабывала ў казачным душы ўражанняў. Спачатку ты стаіш пад цёплым дожджыкам, слухаеш лёгкую музыку, вакол — мяккае чырванаватае святло. Хвіліна зацішша і — маланка з громам, жорсткія, халаднаватыя струмені — нібыта сапраўды пад трапічны лівень трапіла.

Не абмінула я і галакамеру (саляны пакой), і басейн, у якім дадаткова зладжаны вадаспады і джакузі з бурбалкамі. А пасля водных працэдур пазнаёмілася з мясцовым «сонцам». Яно ў выглядзе спецыяльных лямпаў, пад якімі можна пагрэцца і расслабіцца, зззяе ў стылізаваным пад марское ўзбярэжжа пакоі круглы год.



### Пра лебедзяў і паэтаў

Добраўпарадкаваны пляж санаторыя — месца для загару, плавання і... стасункаў з лебедзямі. Царственныя птушкі міласціва прымаюць ежу ад турыстаў. А з пірса, які выдаецца далёка ў возера, адпачывальнікі назіраюць за світанкамі і змярканнямі.

— Мы знаходзімся літаральна ў цэнтры Нарачанскага парку, і маем усе прыродныя фактары, якія спрыяюць аздараўленню. А вялізная тэрыторыя дазваляе падарожнічаць па лесе і карыстацца яго дарамі. Гэта нашы галоўныя перавагі, — упэўнены **Аляксандр ШЧУКО, галоўны ўрач санаторыя «Сосны»**.

У санаторыі кажуць, што прапануюць паслугі, якія адпавядаюць чаканням чалавека. Летам тут хаваюцца ад спякоты, а ў верасні пачынаецца «нашэсце» грыбнікоў ва ўзросце. Час ад часу адпачывальнікі настолькі натхняюцца, што пачынаюць пісаць вершы, хоць раней нават не думалі ні аб чым падобным.

Некаторыя дагэтуль лічаць, што санаторый — рэжымнае месца, куды цябе адпраўляюць далечваца пасля бальніцы, і заняцца тут няма чым. Аднак сучасныя здраўніцы, у якія ператварыліся савецкія санаторыі, нічым не пацвярджаюць такое стаўленне.

Многія прыязджаюць сюды не адзін год, некаторыя цэлымі кампаніямі дамаўляюцца, падгадваюць час пад сумесны прыезд, раяць адпачыць сябрам, якія тут яшчэ не бывалі. Зусім нядаўна з'ехала пара (абодвум ужо за 70), якая адпачывае ў «Соснах» тры разы на год.

### Карыснае з прыемным

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков. Ознакомиться с земельным участком возможно при предварительном согласовании с управлением землеустройства Гомельского райисполкома, позвонив по телефону 36-03-21.

*первоначальная цена предмета аукциона может быть изменена при изменении курса доллара на дату принятия решения.

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 29 (425)



■ Майстар кароткага жанру

## Валерыу БУТУЛЕСКУ:
# «Нейкі час я жыў у душы адной жанчыны. Якая цесната!»



**Ёсць кніжкі, якія можна чытаць з сярэдзіны, уроскід, можна адразу зазірнуць на апошнюю старонку. Іх змест не прывязаны да нейкага сюжэта. І не таму, што аўтар выношваў новы мадэрнісцкі стыль напісання. Проста мудры і таленавіты аж да геніяльнасці пісьменнік здольны ў кароткія выказванні ўкладаць глыбокія разважанні і трапныя высновы. Кніжка афарызмаў слыннага румынскага пісьменніка Валерыу Бутулеску «Пясчаны аазіс» у перакладзе на беларускую мову Міры Лукшы трапіла мне ў рукі выпадкова. І стала настольнай.**

У адрозненне ад тых, хто карыстаецца пры напісанні твораў прыёмам «плынь свядомасці», насамрэч агаляючы сваё падсвядомае, Валерыу Бутулеску імкнецца «забальзамаваць» свой унутраны маналог, надаючы яму завершаную форму ўсвядомленай думкі. У афарызме № 355 аўтар пажартаваў над сваім выбарам такога жанру: «Тоўстыя кнігі выклікаюць павагу. Але часта застаюцца непрачытанымі». Не думаю, што напісанае ім не чытаецца. Больш за тое, Бутулеску самы перакладаемы сучасны літаратар Румыніі: толькі афарызмы перакладзены на больш як 150 моў свету!

На радзіме і за мяжой пастаўлены 17 яго п'ес. Як драматург ён атрымаў шмат узнагарод, з'яўляецца пераможцам многіх прэстыжных літаратурных фэстаў Балгарыі, Грэцыі, Італіі, Польшчы, Канады і інш. І не дзіва, бо паспяховасці спектакля ў значнай ступені спрые пільнасць даследчыка (у гэтым выпадку даследчыка з'яў грамадскага жыцця), а таксама дакладнасць і лаканічнасць апавядальніка. Ці не таму некаторыя афарызмы Бутулеску нібы вырваныя з кантэксту сцэнічных дыялогаў: «Яны не чыталі Дантэ. Яны пра яго чулі і таму прызнаюць пекла ўнукоўцамі», «Неяк убачыў на дрэве дырэктара. Кожная галінка дрыжала пад цяжарам адказнасці», «Трэцяе месца. Першыя два не прысуджаліся з-за адсутнасці грошай», «Першае, што нам хочацца зрабіць, атрымаўшы дрэнную навіну, перадаць яе далей».

А вось гумарыстычнае выказванне «Гэта анталогія нагадвае брацкую магілу», як мне падалося, ужо раней чытала ў дачыненні да нейкага чарговага калектыўнага паэтычнага зборніка. Як, дарэчы, і некаторыя іншыя літаратурныя «перлы», што без аўтарства з'яўляюцца зрэдчас на старонках навін у розных сацыяльных сетках. Пра плагіят, дарэчы, у Бутулеску таксама ёсць адпаведны выраз: «Некаторыя становяцца вядомымі, прыводзячы цытату без двукоссяў». А яго стаўленне да цытавання чужых думак вельмі адназначнае: «Цытаты — фігавае лісце, якое захінае галечу душы».

Ад паблажлівага гумару да рэзка выкрывальнай сатыры, ад асабістых усвядомленых заган да балячак і пошасцяў грамадства прасціраецца дыяпазон аўтарскай творчасці. Высмейвае пісьменнік духоўнае мяшчанства: «Наведаць усе музеі свету і ўспамінаць толькі цэны на білет», «Відаць, грошы — галоўны прынцып жыцця. Пакуль ёсць грошы, можна сабе дазволіць прынцыпы», «З усіх мастацтваў больш за ўсё прыхільнікаў у кулінарнага».

Як прыемна, калі ў творах пісьменніка знаходзіш думкі, сугучныя тваім! А ў невялічкай кніжачцы Валерыу Бутулеску амаль кожны афарызм — нібы адлюстраванне тваіх уласных перажыванняў, расчараванняў і надзей, увасобленых у трапных сказах, што так густоўна аздоблены перчыкам сарказму. Напрыклад: «Што перашкаджае рэформам? Людзі захавалі стары спосаб мыслення, уключаючы апетыт», «Толькі ў хвіліны сумнення я знаходжу раўнавагу», «Госпадзі! Ці ёсць у Цябе алібі ў Варфаламееўскую ноч?»

Алегорыя, эзопава мова не маскіруюць думку аўтара, а толькі падкрэсліваюць яе выснову: «Смецце прысніўся кашмар — венік», «Ластаўкі адлятаюць восенню. Застаюцца абцяжараныя адказнасцю вароны», «Змей меў рацыю: няма раю там, дзе няма кахання».

Трапіўшы ў свет палітычных баталій у якасці члена парламента, аўтар афарызмаў папоўніў свой жыццёвы вопыт чарговымі адкрыццямі, якія спарадзілі новыя фразеалагізмы: «То налева, то направа. Так робіць кар'еру змяя», «Гаспадары сусвету? Мы — мурашы, якія згубіліся на экватары яблыка», «Можна запэцкацца і парашком для чысткі».

Калі я часцей не зразумела або пераклад быў не вельмі дасканалы, ведаю — аўтар не пакрыўдзіцца, бо не можа крыўдаваць чалавек, які сцвярджае: «Уяўленне чытачоў і памылкі друку надаюць афарызмам новы сэнс».

**Ала КЛЕМЯНОК**

■ Ёсць нагода

# ПАД ЗНАКАМ ЛУЧАНКА

**Бадай, адной з самых заўважных культурных падзей тыдня стаў 80-гадовы юбілей вядомага кампазітара Ігара Лучанка. Круглую дату народны артыст СССР і Беларусі, доктар навук, прафесар, акадэмік, старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларусі адзначыў без лішняй помпы і пафасу, разам з сябрамі — звыкла седзячы за піяніна на сцэне Рэспубліканскага дома моладзі.**


Фота БелТА.

Павіншаваць і сёння маладога душой лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола прыйшлі не толькі сябры і калегі-музыканты, але і вядомыя выканаўцы, прадстаўнікі дзяржорганаў, дэпутаты, а таксама актывісты маладзёжнага руху. Так, камсамольцы 80-х падрыхтавалі для імянінніка творчае віншаванне, уручылі ўнікальны юбілейны камсамольскі білет, а прадстаўнікі БРСМ дадалі да музычнай праграмы 10-кілаграмовы святочны торт.

«У мяне аднаго нічога б не атрымалася, са мной заўжды былі побач Уладзімір Мулявін, ансамбль «Песняры», Іосіф Кабзон. Я знаходжу натхненне ў стасунках з людзьмі», — сказаў у адказ на сяброўскія віншаванні кампазітар і дадаў, што ў яго няма любімай уласнай песні: «Усе яны — мае дзеці».

Адмысловым падарункам не толькі для кампазітара, але і для даўніх прыхільнікаў яго творчасці стаў дакументальны фільм «Ігар Лучанок: аб песнях, Радзіме, аб сябрах», які прэзентавалі на ўрачыстым вечары аўтар-сцэнарыст, рэжысёр Уладзімір Арлоў і прадзюсар, кіраўнік студыі дакументальнага фільма Уладзімір Бокун.

Асновай стужкі, якая складаецца з навел, прысвечаных самым вядомым песням Лучанка, сталі інтэрв'ю Ігара Міхайлавіча і яго жонкі Аляксандры Рыгораўны, якія пражылі разам ужо 53 гады, а таксама рэдкія кадры 1982 года з Дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў.

8 жніўня ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры адкрылася выстаўка «Зачараваны музыкай», прысвечаная Ігару Лучанку. Убачыць дакументальныя матэрыялы, фотаздымкі, афішы розных гадоў, некаторыя асабістыя рэчы кампазітара можна будзе да 24 жніўня.

Дарэчы, сёлета знакавую дату адзначылі ўжо некалькі разоў — тэматычнымі канцэртамі на Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, на «Славянскім базары ў Віцебску», таксама ў канцы верасня адбудзецца гала-канцэрт у гонар Ігара Лучанка ў Белдзяржфілармоніі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

### Яшчэ 5 фактаў пра Ігара Лучанка

**● Песня-балада «Памяць сэрца» на вершы паэта М. Ясеня ў выкананні Віктара Вуячыча ў 1966 годзе стала пераможцай І Усесаюзнага конкурсу савецкай песні. Сярод канкурэнтаў беларусаў на конкурснай сцэне былі не хто-небудзь, а Іосіф Кабзон і Вадзім Мулерман, якія ў выніку сталі толькі лаўрэатамі. З гэтай гісторыі магло б вырасці непрымірымае саперніцтва, а атрымалася — шматгадовае сяброўства.**

**● Агулам на творчым рахунку кампазітара больш як 300 песень, прычым некаторыя з іх, як «Польку беларускую», слухачы лічаць народнымі. А на самыя вядомыя лірычныя кампазіцыі — «Алеся,» «Вераніка», «Зачараваная» ды іншыя — кампазітара натхніла жонка.**

**● Прыпеў «Песні пра Мінск» гучыць у беларускай сталіцы штогадзіну — на курантах гарадской ратушы.**

**● Скончыўшы ў 1961 годзе Беларускую дзяржаўную кансерваторыю, кампазітар на гэтым не спыніўся і атрымаў яшчэ дзве вышэйшыя музычныя адукацыі — у Ленінградскай і Маскоўскай кансерваторыях.**

**● Аўтарству Лучанка належыць адна з першых савецкіх рок-опер — «Гусляр» на словы Янкі Купалы, напісаны супольна з ансамблем «Песняры».**

# ДА СКАРБНІЦ ВЕРЫ І ПІСЬМЕНСТВА

Штогадовая Рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў» з Дабратворным агнём ад Гроба Гасподняга па добрай традыцыі з'яўляецца састаўной часткай Дня беларускага пісьменства. Сёлета ў апошнія дні жніўня экспедыцыя дваццаць пяты раз адправіцца па чарговым маршруце праз гарады і вёскі Беларусі. Прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі разам з духавенствам наведаюць розныя рэгіёны краіны і завершаць сваё перадсвяточнае паломніцтва ў Іванаве — сёлетняй сталіцы Дня беларускага пісьменства.


Фотавыстаўка пра дзейнасць экспедыцыі ў зале Ружанскай бібліятэкі. Матэрыялы экспазіцыі падрыхтаваныя ў рэдакцыі газеты «Звязда».

У гэтыя дні арганізатары экспедыцыі заняталі адказнай справай: схематычна пракладзены маршрут давадзіцца да ведама мясцовых улад, царкоўнай грамадскасці, каб разам выпрацаваць найбольш зручны план для сустрэч з жыхарамі населеных пунктаў, правядзення там набажэнстваў, творчых сустрэч, навукова-практычных канферэнцый. Наведваючы мясціны будучай паездкі, арганізацыйныя групы таксама праводзяць творчыя сустрэчы з жыхарамі, знаёмяць з фотавыстаўкай матэрыялаў папярэдніх экспедыцый.

Скарбніца нашай веры і духоўнасці, спадчыннае багацце нашага пісьменства — вось пра што будуць расказваць падчас экспедыцыі вядомыя літаратары, гісторыкі, дзеячы мастацтва. Ва ўсіх населеных пунктах разам з жыхарамі, насельнікамі манастыроў і прыхаджанамі храмаў яны будуць (як гэта рабілі ва ўсе мінулыя гады) садзіць дрэўцы сімвалічнага Саду супольнай малітвы. На ўсім маршруце будуць асвячаць Дабратворным агнём ад Гроба Гасподняга помнікі славы і мужнасці нашага народа, на пахаваннях загінулых воінаў і партызан прагучаць памінальныя ліціі. Удзельнікі сёлетняга паломніцтва наведаюць школы і правядуць урокі беларускага пісьменства.


Царква Святой Тройцы ў Целяханах — адзін са старажытных храмаў, дзе пабывала група падрыхтоўкі экспедыцыі.

Агульная працягласць маршруту дваццаць пятай рэспубліканскай экспедыцыі «Дарога да святыняў» складзе тысячу кіламетраў. 29 жніўня яна пабывае ў Лагойскім, Смалявіцкім, Пухавіцкім раёнах. 30 жніўня — у Дзяржынскім, Клецкім раёнах. 31 жніўня — у Баранавіцкім, Пружанскім, Івацэвіцкім раёнах. 1 верасня ў Пінскім, Іванаўскім раёнах. 2 верасня пасля Божай літургіі экспедыцыя прыме ўдзел ва ўрачыстым адкрыцці Свята беларускага пісьменства ў Іванаве.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**

■ Юбілей

## Уладзімір ПРАКАПЦОЎ:

# «МАЯ КВАТЭРА — ФІЛІЯЛ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦКАГА МУЗЕЯ»

**Бакалам шампанскага, кубкам гарачага шакаладу і аўтарскай выстаўкай сваё 65-годдзе сустрэў Уладзімір Пракапцоў. Мастак, мастацтвазнавец, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея, які пашырае межы сваёй установы, трымаецца высокага густу ў яе выставачнай дзейнасці і робіць музей папулярным сярод наведвальнікаў. Юбілей аднаго з самых знакавых беларускіх музейшчыкаў адзначаўся 8 жніўня. У гэты ж дзень у мастацкім была адкрыта аўтарская выстаўка «Мая Беларусь», на якой можна ўбачыць работы, якія дагэтуль не выстаўляліся. Напярэдадні мы прыйшлі ў вотчыну Уладзіміра Пракапцова, заспелі яго ў перад'юбілейнай мітусні і задалі некалькі пытанняў.**



***— У нашым мастацкім асяроддзі людзі, звязаныя з Віцебскам, заўсёды неяк вылучаюцца. Вы вучыліся ў гэтым горадзе, ці паўплываў ён на вас?***

— Так, безумоўна, сваёй мастацкай атмасферай. Віцебскія вуліцы, можа быць, не такія шырокія як праспекты Мінска, але там заўсёды адчувалася асаблівая аўра, звязаная з 1920-мі гадамі, Шагалам, Малевічам. На нашым факультэце кожны хацеў стаць знакамітым, як Марк Шагал. Дарэчы, я падаваў дакументы ў тэатральна-мастацкі інстытут у Мінску, у тыя гады конкурс на ўсе яго спецыяльнасці быў па дзесяць і больш чалавек. Але паколькі ў мяне ў вёсцы не было дзе ўдасканальвацца, а ў мінчукоў былі нават свае студыі, мне сказалі, што спачатку трэба прайсці падрыхтоўчыя курсы. Я не шкадую, што не трапіў у Мінск, бо ў Віцебску, на мастацка-графічным факультэце, нас рыхтавалі ў больш шырокім кірунку. На жывапіс, можа быць, дастаткова часу і не было, хоць мы самі заставаліся пісаць вечарамі, але мы атрымалі больш прафесійных навыкаў. Я і зараз сам таніру рамы і ведаю, якая пасуе больш. Тут была падрыхтоўка да жыцця, багата самых розных дысцыплін, мы атрымалі каштоўную загартоўку — жылі бедна, але ўсё маглі рабіць сваімі рукамі. Мне нават падаецца, што нашы выпускнікі ў мастацкім плане больш актыўныя, бо горад з вялікімі традыцыямі і нашы настаўнікі навучылі нас быць рознабаковымі.

***— Калі вы займаеце пасаду дырэктара Нацыянальнага музея, ваш бэкграўнд, густ і погляд на мастацтва непазбежна адбіваюцца на прыярытэтах установы ў цэлым...***

— Мне лёгка працаваць, таму што я маю тры іпастасі. Дзякуючы мастацкай адукацыі магу на роўных размаўляць з любым мастаком. Да таго ж я скончыў Інстытут мастацтвазнаўства ў Акадэміі навук і абараніў дысертацыю ў Маскве — у выніку і практычна, і тэарэтычна падкаваны. Я атрымаў добрую школу як адміністратар — у ЦК камсамола быў загадчыкам аддзела культуры, шэсць з паловай гадоў працаваў у апараце Савета Міністраў, дзе навучыўся не проста рыхтаваць урадавыя дакументы, але глядзець на ўсё глабальна. Калі міністр культуры Аляксандр Сасноўскі прапаноўваў мне стаць дырэктарам музея — мне тады было 44 гады — я тры разы адмаўляўся. Баяўся, што не спраўлюся, бо дагэтуль ніколі не працаваў у музеі, нават у раённым. А потым усё ж пайшоў, калі ў музеі з'явіліся самавылучэнцы і мне пазванілі самі супрацоўнікі. У выніку я магу з кожным мастаком падтрымаць размову і валодаю адміністрацыйным рэсурсам. Не кожны сябра Саюза мастакоў можа ў нас выставіцца, тут не праходзіць папса і некаторыя нават «каранаваныя» персоны. Двойчы на прапанову зрабіць выстаўку Нікаса Сафронава, я сказаў «не, яе не будзе». У аўтараў самы розны ўзровень, і я магу яго даказаць. Як член калегіі я зняў з парадку дня двух кандыдатаў на званне народнага мастака: у сваім катэгарычным выступленні аргументаваў, чаму іх узровень не адпавядае патрэбнаму. Таму тут мне лёгка працаваць, але я не мог бы стаць рэктарам Акадэміі музыкі, таму што не ведаю нотнай граматы. Мяне ўвогуле здзіўляе, як некаторыя людзі бяруцца кіраваць чым заўгодна.

***— Раскажыце, на што музей арыентуецца ў папаўненні фондаў і яго выставачнай дзейнасці?***

— Ён заняў сваю нішу. Мы не ўсёедныя, не кідаемся на папсу і, скажам, актуальнае мастацтва, бо для іх ёсць адпаведныя прасторы. Пры гэтым мы займаемся не толькі акадэмічнымі рэалістычнымі творамі: у якасці эксперымента арганізуем «фармальныя» выстаўкі, але з высокім густам і вялікіх мастакоў. Наш музей дакладна прытрымліваецца свайго кірунку, я праводжу гэтую палітыку. Некаторыя аўтары ніколі не змогуць у нас выставіцца. Сюды павінны трапляць самыя-самыя. Хутка, напрыклад, будзе выстаўка да стагоддзя Ізраіля Басава, не акадэміста, не рэаліста, але вялікага мастака. З новага года мы памяняем прынцыпы выставачнай дзейнасці — будзе мінімум персанальных экспазіцый, калі толькі знакавых, правераных часам аўтараў, як Ізраіль Басаў ці Віталь Цвірка, а ўсё астатняе будзе падпарадкоўвацца пэўным тэмам. Унікальным стане прысвячэнне хлебу, прычым не проста пейзажамі, дзе расце жыта, але і работамі, што адсылаюць да хлеба ў больш шырокім, філасофскім сэнсе. Зараз з вялікім поспехам праходзіць выстаўка беларускіх і польскіх мастакоў на вельмі прыгожую тэму каня. Мы маглі б зрабіць экспазіцыю цалкам з нашых фондаў (многія работы ніколі не выстаўляліся), але вырашылі сыграць на кантрасце з польскімі мастакамі. У некаторых жа псіхалогія не прадугледжвае шанаванне свайго, а калі нехта з-за рэчкі прыехаў — тады так. Вось мы і паказваем выдатныя работы і польскіх аўтараў, і нашых.

***— Як з такой арыентацыяй на, скажам, акадэмізм зрабіць музей больш папулярным?***

— Дакладна не апускацца да папсы, але ўсё рабіць крэатыўна. Мы ўжо не працуем як раней — павесілі карціны, селі і чакаем, хто прыйдзе. Сёння мы задзейнічаем рэкламу, арганізуем цікавыя мерапрыемствы, як, напрыклад, «Вераснёвая ноч» з выстаўкамі і прэзентацыяй шакаладу, што будзе прысвечана Дню горада. Народ зноў пацягнуўся на лекцыі: апошнія два тыдні шмат людзей прыходзіла паслухаць пра Айвазоўскага. У пашане праграма для сем'яў (збіраецца сямейны, так сказаць, клан, у якім тры-чатыры пакаленні), каля сямнаццаці педагагічных праграм. Мы не сядзім на месцы і маем што прапанаваць для кожнай катэгорыі — для дашкольнікаў, школьнікаў, студэнтаў, дарослых, пажылых людзей. Сёння на парадку дня стварэнне безбар'ернага асяроддзя, каб да нас маглі прыйсці глуханямыя і людзі са слабым зрокам, рыхтуецца абсталяванне для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў перамяшчэнні. У выніку як бы ні развіваліся тэхналогіі, музей усё яшчэ запатрабаваны. Нехта ж казаў, што тэлебачанне знішчыць тэатр, усе будуць смажыць бульбу з салам і сядзець на канапе перад тэлевізарам. Але тэатр оперы і балета, Купалаўскі і іншыя тэатры перапоўненыя. У нармальных сем'ях бацькі хочуць, каб іх спадчыннікі развіваліся гарманічна, хадзілі ў тэатры і музеі. Для гэтага мы павінны прапаноўваць адпаведныя паслугі. Мы нават арганізуем фотасесіі для маладажонаў. Калі яны хочуць зрабіць фотаздымак на фоне карцін — чаму не, гэта ж прыгожа. Галоўнае, каб культурныя інстытуцыі не пляліся за натоўпам, хай гэта гучыць і груба. Трэба натоўп перацягваць на свой бок, а для гэтага — ісці наперадзе. Для чаго ў 1957 годзе, калі людзі яшчэ жылі, умоўна, у бараках, адбудоўваўся музей? Для чаго мы за вялікія грошы набываем карціны? У музея вельмі адказная місія — ідэалагічная.

***— Што адбываецца паміж абывацелем і мастацкай сферай? У адным з інтэрв'ю вы сказалі, што «наш народ пакуль не падрыхтаваны да таго, каб хадзіць у музеі, як у Еўропе».***

— Ну як не падрыхтаваны — падрыхтаваны, але ўсё залежыць ад сямейнага дабрабыту. Мы ў цэнтры Еўропы, але ў нас няма сталай традыцыі хадзіць на выстаўкі. Як і няма, напрыклад, традыцыі па вечарах сустракацца са знаёмымі за кубкам кавы, хоць моладзь яе пераймае. У Еўропе гэта стагоддзямі развівалася, а мы прывыклі замест віна ў кавярні смажыць дома бульбу. Гэта можа быць звязана з бюджэтам альбо з тым, што ў вольны час людзі вырашаюць свае праблемы. Тым не менш — дарэчы, зараз наш музей працуе без выхадных — паглядзіце, колькі ў нас людзей у суботу і нядзелю. Можа быць, усё развіваецца не так хутка, як хацелася б, але механізм запушчаны.

***— Задам «юбілейнае» пытанне. Бачна, што мастацтва вас захапляе. Ці не шкадуеце вы, што не прысвяцілі сваё жыццё жывапісу — працы ў майстэрні з раніцы да вечара?***

— Калі б я паступіў у тэатральна-мастацкі інстытут, можа і быў бы чыста мастаком. Але я прыйшоў у музей і з тых часоў пастаянна знаходжуся ў будоўлі. Я зрабіў прыбудову, якая восем гадоў ніяк не выкарыстоўвалася, паралельна займаўся рэканструкцыяй Мірскага замка, нашага філіяла. Пятнаццаць гадоў я гэтаму прысвяціў, трэба было бегаць плаціць працэнтоўкі ў казначэйства, гэта не так і проста. Кожны аўторак за сто кіламетраў ездзілі на планёрку. Зрабіў — у музея Мірскі замак забралі. Зараз мы займаемся музейным кварталам, трэба нешта яшчэ ўзяць па суседстве, таму што калі не возьмеш — ніхто не возьме. Канешне, на жывапіс мне фізічна не хапае часу. Гэта мая біяграфія: калі не я, то хто? Я не магу быць лагодным і сядзець як мыш пад венікам, кожны год у мяне з усімі міністрамі «дзелавыя адносіны». Таму не атрымліваецца пісаць столькі, колькі іншыя. Вось мой калега з Арменіі: пайшоў раніцай у майстэрню, пісаў, прыйшоў у музей, падпісаў фінансавыя дакументы, вярнуўся ў майстэрню. А ў мяне будоўля, нарады і іншае. Затое жывапіс дае магчымасць пераключацца і дазваляе трымаць форму.

***— Ці шмат у вас дома карцін?***

— Ды ў мяне карцін — мора! Каля пяцідзесяці я нават перадаў Добрушскаму музею. Кватэра ўжо ломіцца ад работ нашых мастакоў, ёсць кітайскія. Няма куды вешаць, жонка нават на дачы ўсё месца заняла. Мая кватэра — філіял Нацыянальнага мастацкага музея.

***— Ведаючы пра ўсе вашы рэгаліі, хачу запытаць, якое сваё дасягненне вы лічыце найважнейшым.***

— Я бачу плён сваёй работы, калі адкрываецца выстаўка. Бачна, што для музея я папрасіў у Прэзідэнта будынак на Карла Маркса, які планаваўся пад гасцініцу. Развіваецца музейны квартал. У 2001 годзе я гартаў маленькі праваднік, у канцы якога было напісана, што Нацыянальны мастацкі музей размяшчаецца ў пяці залах. Я сказаў, маўляў, будзем рабіць музейны квартал, а мае супрацоўнікі палічылі мяне вар'ятам. Сёння ў тых пяці залах толькі рускае мастацтва. Думаю, мае папярэднікі — Мікалай Міхалап, Алена Аладава і Юрый Карачун — былі б задаволены маёй работай. Нейкі след я пакіну і ў першую чаргу як дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея.



«Сустрэча».

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

## Извещение о проведении 5 сентября 2018 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | – «лит.А1-2/к-кп, здание прачечной» общей площадью 1012 кв. м (инв. номер в ЕГРНИ 500/С-34660; назначение: здание неустановленного назначения) с элементами благоустройства: автодорога (540 кв. м), площадка под автостоянки (240 кв. м), пешеходная дорожка (206 кв. м), площадка под мусоросборник (4 кв. м), площадка (3 кв. м), бордюр 0,16 (40 кв. м, 251,22 м.п.), ограждение территории (16,40 п. м), ограждение площадки под мусоросборник (5,50 п. м), ворота (4,40 п. м), ворота (7,60 п. м);<br>– электросети КЛ_0,4КВ (инв. № 3000842) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Кабушкина, д. 64 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 0,3900 га, кадастровый номер 500000000002001769, назначение – эксплуатация и обслуживание здания прачечной |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 616 435,26 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 61 000,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |
| **Наличие обременений** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 5 сентября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 14.08.2018 по 03.09.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов

• Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Гофробум», 223013, Минский район, Минская обл., д. Василевщина, здание зернохранилища № 2, к. 3 |

**Предмет аукциона** – объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, пер. Менделеева 1-й, 50 (2,3)

| Наименование (Назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Помещение общественного питания** | 635,2 | 500/D-708163897 |
| **Складское помещение** | 111,1 | 500/D-708163898 |

**Начальная цена с НДС 20 %: 438 824,40 долларов США** (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **13.09.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **11.09.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42.<br>Email: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок»

Дата и время проведения: 23.08.2018 в 11.00

Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 09.00 10.08.2018 до 09.00 23.08.2018.

| № лота | Наименование | Инвентарный номер | Год выпуска, приобретения | Начальная цена с учетом дисконта 60 % (четвертые повторные торги) | Шаг аукциона, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Установка для размотки бухт | 4935 | 1989 | 485,72 | 48,58 | 24,29 |
| 2 | Фальцепрокатный м-м ОКС-8906 | 4501 | 1980 | 842,00 | 84,20 | 42,10 |
| 3 | Фальцеосадочный мех-м СТД-25 | 4336 | 1970 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 4 | Фальцепрокатный мех-м СТД-16А | 4350 | 1979 | 842,00 | 84,20 | 42,10 |
| 5 | Пневмолистогибочный м-м И2116 | 4808 | 1983 | 2 864,00 | 286,40 | 143,20 |
| 6 | Пневмолистогиб | 4989 | 1990 | 2 864,00 | 286,40 | 143,20 |
| 7 | Механизм для вальцовки ВМС-85 | 4323 | 1966 | 3 202,00 | 320,20 | 160,10 |
| 8 | Мех-м вальцепрокатный ОКС-9106 | 4939 | 1990 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 9 | Фальцеосадочный мех-м 5Н-475 | 4842 | - | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 10 | Фальцеосадочный мех-м СТД-25 | 4332 | 1970 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 11 | Зигмашина ИБ-2713 | 4322 | 1965 | 1 432,00 | 143,20 | 71,60 |
| 12 | Машина точечной сварки МТ2201 | 5078 | - | 2 360,00 | 236,00 | 118,00 |
| 13 | Зигмашина ВМС-76В | 4321 | 1979 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 14 | Зигмашина ВМС | 4867 | 1980 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 15 | Зигмашина ВМС-76В | 4342 | 1979 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 16 | Зигмашина ИБ-2713 | 4338 | 1965 | 1 432,00 | 143,20 | 71,60 |
| 17 | Зигмашина ВМС-76В | 4339 | 1979 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 18 | Зигмашина ВМС-76В | 4809 | 1984 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 19 | Зигмашина ВМС-76В | 4925 | 1990 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 20 | Зигмашина ВМС-76 | 4320 | 1976 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 21 | Зигмашина ИБ-2713 | 4337 | 1965 | 1 432,00 | 143,20 | 71,60 |
| 22 | Зигмашина ВМС-76В | 4844 | 1988 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 23 | Механизм для вальцевания ОКС8998 | 8138 | 1982 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 24 | Фальцепрокатный мех-м СТД-16А | 4352 | 1980 | 842,00 | 84,20 | 42,10 |
| 25 | Пресс механический КБ-262 | 4848 | 1987 | 8 764,00 | 876,40 | 438,20 |
| 26 | Ножницы гильотинные НБ-3118 | 4829 | 1987 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 27 | Лебедка стационарная | 8139 | 1988 | 726,11 | 72,62 | 36,31 |
| 28 | Ножницы гильотинные НА-3118 | 4522 | 1980 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 29 | Горизонтально-фрезер. ст. 6Р-82 | 4007 | 1975 | 1 560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 30 | Вертикально-фрезерный ст. ВМ127М | 4952 | 1991 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 31 | Пресс листогибочный кривошипный | 7000 | 2006 | 4 868,36 | 486,84 | 243,42 |
| 32 | Станок продольно-строгальный 7Б112 | 54391 | 1991 | 17 271,94 | 1 727,20 | 863,60 |
| 33 | Ст-к настольно-сверлильный 2МН2 | 4450 | 1972 | 248,00 | 24,80 | 12,40 |
| 34 | Координатно-расточной ст. 2В440А | 4451 | 1973 | 1 104,00 | 110,40 | 55,20 |
| 35 | Круглошлифовальный станок 312М | 4465 | 1980 | 560,00 | 56,00 | 28,00 |
| 36 | Плоскошлифовальный станок 3Б722 | 4470 | 1979 | 2 212,00 | 221,20 | 110,60 |
| 37 | Универсально-заточной ст-к 3В642 | 4471 | 1988 | 2 268,00 | 226,80 | 113,40 |
| 39 | Ст. горизонтально-строгальн. 73071 | 4552 | 1980 | 1 520,00 | 152,00 | 76,00 |
| 40 | Автомат токарный 1Б240-6К | 8106 | 2013 | 3 031,23 | 303,13 | 151,57 |
| 41 | Токарно-револьверный станок 1341Н | 4987 | 1974 | 1 266,00 | 126,60 | 63,30 |
| 42 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4997 | 1990 | 810,00 | 81,00 | 40,50 |
| 43 | Печь электрическая СН3-4 | 5090 | 1970 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 44 | Ст. горизонтально-фрезерн. 6Р82 | 62581 | 2008 | 762,84 | 76,29 | 38,15 |
| 45 | Пылеотсос ЗИЛ900 | 45991 | 1984 | 168,00 | 16,80 | 8,40 |
| 47 | Вертикально-сверлильный ст. 2Н-135 | 4891 | 1989 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 48 | Горизонтально-фрезерный ст-к 6Р82 | 4007 | 1975 | 1 560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 49 | Продольно-шлифовальный ст. 3Д722 | 4910 | 1989 | 2 212,00 | 221,20 | 110,60 |
| 50 | Станок 3Е642Е | 7020 | 1990 | 2 268,00 | 226,80 | 113,40 |
| 51 | Станок фрезерный 6Т82-1 | 4922 | 1987 | 2 016,00 | 201,60 | 100,80 |
| 52 | Вертикально-фрезерный ст. ВМ127М | 4952 | 1991 | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 53 | Резьбонарезной механизм ВМС2А | 4980 | 1979 | 810,00 | 81,00 | 40,50 |
| 54 | Пресс механический КД-2328 | 4200 | 1980 | 2 100,00 | 210,00 | 105,00 |
| 55 | Автомат отрезной 8Г662 | 4438 | 1980 | 1 848,00 | 184,80 | 92,40 |
| 56 | Токарно-револьверный станок 1П365 | 4440 | 1980 | 560,80 | 56,08 | 28,04 |
| 57 | Ст. токарно-винторезн. 1М63Ф101 | 4441 | 1980 | 800,00 | 80,00 | 40,00 |
| 59 | Труборез 5Н-428 | 4231 | 1979 | 672,00 | 67,20 | 33,60 |
| 60 | Трубогиб СТД-439 | 4199 | 1979 | 1 008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 61 | Трубогиб ОКС-8943 | 4271 | 1982 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 62 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4840 | 1987 | 810,00 | 81,00 | 40,50 |
| 63 | Пресс К-2130 | 4542 | 1978 | 1 840,00 | 184,00 | 92,00 |
| 64 | Пресс КД-2128К | 4795 | 1985 | 2 200,00 | 220,00 | 110,00 |
| 65 | Листогибочное устр-во 5М-176 | 4784 | 1980 | 3 400,00 | 340,00 | 170,00 |
| 66 | Пресс механический КБ-245 | 4529 | 1975 | 1 371,63 | 137,17 | 68,59 |
| 67 | Пресс механический К-2124 | 4315 | 1967 | 1 334,00 | 133,40 | 66,70 |
| 68 | Пресс механический КД-2124Е | 4556 | 1983 | 1 334,00 | 133,40 | 66,70 |
| 69 | Пресс механический КД-2328Е | 4454 | 1980 | 2 100,00 | 210,00 | 105,00 |
| 70 | Машина точеч. сварки МТ-1618 | 5316 | 1978 | 1 680,00 | 168,00 | 84,00 |
| 71 | Пресс механический КД-2326 | 4258 | 1968 | 1 428,00 | 142,80 | 71,40 |
| 72 | Пресс механический КД-2326 | 4341 | 1979 | 1 428,00 | 142,80 | 71,40 |
| 74 | Листогиб СТД-9А | 4329 | 2002 | 218,96 | 21,90 | 10,95 |
| 75 | Пресс КД-2128К | 4795 | 1985 | 2 200,00 | 220,00 | 110,00 |
| 76 | Пресс КЕ2330 | 4927 | | 1 989,40 | 198,94 | 99,47 |
| 77 | Ст. токарно-винторезный 1Д95 | 4446 | 1980 | 1 496,00 | 149,60 | 74,80 |
| 78 | Горизонтально-фрезер. ст-к 6РВ2 | 4459 | 1980 | 1 560,00 | 156,00 | 78,00 |
| 79 | Ст. радиально-сверлильный 2Л534 | 4469 | 1979 | 1 360,00 | 136,00 | 68,00 |
| 80 | Вертикально-сверлильн. ст. 2Н135 | 4570 | 1972 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 81 | Обдирочно-шлифовал. ст-к 3К-634 | 4936 | 1990 | 358,00 | 35,80 | 17,90 |
| 82 | Вертикально-фрезерный ст. 6Р-11 | 4006 | 1980 | 1 800,00 | 180,00 | 90,00 |
| 83 | Вертикально-фрезерный ст. 6Р-12 | 4958 | 1975 | 1 800,00 | 180,00 | 90,00 |
| 84 | Станок круглопильный Ц6-2 | 4010 | 1979 | 596,00 | 59,60 | 29,80 |
| 85 | Станок точильно-шлифовальный 312М | 5328 | 1964 | 1 120,00 | 112,00 | 56,00 |
| 86 | Обдирочно-заточной ст-к с обор. лист | 4026 | 1980 | 317,60 | 31,76 | 15,88 |
| 87 | Сверлильный агрегат | 6240 | 2006 | 1 488,42 | 148,85 | 74,43 |
| 88 | Вертикально-сверл. ст-к 2Н-125Л | 4207 | 1974 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 89 | Трубогиб | 4221 | 1979 | 588,00 | 58,80 | 29,40 |
| 90 | Труборез 5Н-428 | 4227 | 1979 | 672,00 | 67,20 | 33,60 |
| 91 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4234 | 1973 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 92 | Вертикально-сверл. ст-к 2Н-135 | 4244 | 1970 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 93 | Станок сверлильный МН-18Н-49 | 4599 | 1991 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 94 | Резьбонарезной механизм ВМС-2 | 4232 | 1970 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 95 | Механизм трубогибочный СТД439 | 4878 | 1980 | 1 008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 96 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4884 | 1988 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 97 | Резьбонарезной механизм ВМС-2АВ | 4920 | 1990 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 98 | Пресс КВ 2132 | 4796 | 1985 | 3 864,00 | 386,40 | 193,20 |
| 99 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4240 | 1979 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 100 | Трубогиб СТД-102 | 4242 | 1979 | 588,00 | 58,80 | 29,40 |
| 101 | Резьбонарезной механизм ВМС-2А | 4550 | 1972 | 806,00 | 80,60 | 40,30 |
| 102 | Ножницы гильотинные НА-3118 | 4328 | 1980 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 103 | Пресс механический КД-2128 | 4526 | 1973 | 2 200,00 | 220,00 | 110,00 |
| 104 | Пресс механический КД-2130 | 4525 | 1973 | 1 840,00 | 184,00 | 92,00 |
| 105 | Зигмашина СТД-865 | 4801 | 1983 | 3 192,00 | 319,20 | 159,60 |
| 106 | Пресс РС-10М1 | 4880 | 1989 | 5 040,00 | 504,00 | 252,00 |
| 107 | Зигмашина ВМС-76В | 4926 | 1990 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 108 | Пресс КД-2326 | 4314 | 1996 | 2 352,00 | 235,20 | 117,60 |
| 109 | Пресс механический КД-2326Е | 4316 | 1980 | 2 352,00 | 235,20 | 117,60 |
| 110 | Фальцеосадочный мех-м СТД-25 | 4324 | 1966 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 111 | Зигмашина ВМС-76В | 4344 | 1980 | 1 180,00 | 118,00 | 59,00 |
| 112 | Линия для производства профнастила | 7003 | 2011 | 10 111,27 | 1 011,13 | 505,57 |
| 113 | Ручные клещи контак. свар. TECHA7902 | 8096 | 2013 | 745,26 | 74,53 | 37,27 |
| 114 | Пресс КД 2128 | 4923 | 1990 | 2 200,00 | 220,00 | 110,00 |
| 115 | Пресс пневмомеханический | 8142 | 1978 | 3 472,44 | 347,25 | 173,63 |
| 116 | Установка для вулканита | 8143 | 1979 | 1 058,12 | 105,82 | 52,91 |
| 117 | Установка для гибки полосы | 8144 | 1992 | 1 006,56 | 100,66 | 50,33 |
| 118 | Пневмопресс | 8126 | 2002 | 837,31 | 83,74 | 41,87 |
| 119 | Станок сверлильно-настольный | 8127 | 1972 | 279,50 | 27,95 | 13,98 |
| 120 | Пресс механический КТП К-242А | 8128 | 1980 | 1 211,32 | 121,14 | 60,57 |
| 121 | Пресс-ножницы 5М-85 | 4310 | 1981 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 122 | Машина точечной сварки МТ-1618 | 5081 | 1978 | 1 680,00 | 168,00 | 84,00 |
| 123 | Машина для вальцовки ОКС 8998 | 4365 | 1982 | 2 800,00 | 280,00 | 140,00 |
| 124 | Пресс механический КД 2330-02 | 4453 | 1980 | 2 688,00 | 268,80 | 134,40 |
| 125 | Вертикал-сверлильный ст-к 2Н-135 | 4463 | 1980 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 126 | Вертикально-сверлильный станок | 4531 | 1972 | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 127 | Станок отрезной 8Г240КЛ.Н | 4928 | 1997 | 278,00 | 27,80 | 13,90 |
| 128 | Пресс механический КД-2124К2.1Т | 4950 | 1991 | 1 334,00 | 133,40 | 66,70 |
| 129 | Станок для рубки уголка и круга | 8137 | 1988 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 130 | Настольно-сверлильный станок | 4001 | | 248,00 | 24,80 | 12,40 |
| 131 | Обдирочный станок 3К633 | 4908 | | 420,00 | 42,00 | 21,00 |
| 132 | Кран конс. пов. эл. г/по.0,5ТС | 6045 | 1980 | 1 000,00 | 100,00 | 50,00 |
| 133 | Станок отрезной ножовочный 872М | 4009 | 1971 | 350,00 | 35,00 | 17,50 |
| 134 | Кран подвесной г/п 5 тн | 27 | 1976 | 900,00 | 90,00 | 45,00 |
| 135 | Набор мягкой мебели «Рикардо 1» | 6518 | | 644,40 | 64,44 | 32,22 |

3. Продавец и организатор торгов: ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок», тел. +375163414964.

4. Место проведения: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46, здание администрации.

5. Место нахождения предмета торгов: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46.

6. Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет предприятия, с отметкой банка Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение десяти рабочих дней со дня их проведения. Кроме того, представляются следующие документы:

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора) и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона,

доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.

7. Ознакомиться с предметами торгов можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375298091058.

8. По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.

9. С победителем торгов продавцом в срок не позднее 5 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги, не позднее 3 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи.

10. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть подан этому участнику по цене, превышающей начальную, на 5 %.

УНП 200240785

КЛАКСАН

# «ШАЙБЫ», «КАНВЕРТЫ» І «МАЛАТОЧКІ»

## Карэспандэнт «Звязды» разам з Транспартнай інспекцыяй адправілася ў рэйд

**«З'езд у кювет ранкам бадзёрыць лепей за каву. Дзякуй, што без ахвяр», — з такімі словамі «ўдзячнасці» на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы звярнулася да фірмы-перавозчыка пасажырка міжнароднага рэгулярнага рэйса Мінск — Бабруйск — Мазыр — Кіеў — Адэса. На борце — 47 чалавек, амаль палова — дзеці. 4.30 раніцы. У кювеце каля вёскі Светачоўка пад Оршай ляжыць на баку аўтобус, больш за 50 пасажыраў якога ехалі з Кіева ў Талін. Частку з іх шпіталізавалі, але сур'ёзных траўмаў, як і ў першым выпадку, ніхто не атрымаў. Падобныя гэтыя аварыі не толькі маршрутам і шчаслівым выпадкам у выглядзе адсутнасці ахвяр, але і найбольш магчымай прычынай інцыдэнтаў: кіроўца заснуў за рулём.**




Экіпаж Транспартнай інспекцыі.

Восем гадзін раніцы, дыспетчарская станцыя «Дружная» Мінска. На прыпынках, паміж аўтобусамі стаяць групкі людзей — чамаданы і заплечнікі выдаюць у іх будучых падарожнікаў. Хтосьці топчацца ў чаканні свайго рэйса да мора, а некаторыя ўжо грузяць рэчы ў велізарныя турыстычныя аўтобусы. Нават сярод гэтай мітусні лёгка заўважыць герояў матэрыялу: форменныя кепкі, салатныя жылеты са святловяртальнымі стужкамі і надпісам «Транспартная інспекцыя». Экіпаж складаецца з двух вядучых спецыялістаў упраўлення кантролю аўтамабільнага транспарту філіяла Транспартнай інспекцыі па горадзе Мінску і Мінскай вобласці. **Уладзімір МАРЦІНЕЎСКІ** на службе ва ўстанове ўжо 10 гадоў. Пра свайго калегу **Вячаслава САРЖЫЦКАГА** жартуе, што той працаваў у інспекцыі яшчэ да яе з'яўлення. Але, як вядома, у любым жарце толькі частка жарту: Вячаслаў Міхайлавіч быў супрацоўнікам «Інтэраўтатранса», які пазней ператварыўся ў Транспартную інспекцыю.

Сёння спецыялісты выйшлі на кантроль рэжыму працы і адпачынку кіроўцаў міжнародных аўтамабільных пасажырскіх перавозак. Транспартная інспекцыя мае права на тэрыторыі Беларусі праводзіць праверку любых транспартных сродкаў, якія здзясняюць міжнародныя пасажырскія ці грузавыя рэйсы.



Тахаграмы, празваныя «шайбамі».

— Мы правяраем у асноўным транспарт, які вяртаецца з падарожжа. Кантроль ажыццяўляецца на аснове даных тахографаў — лічбавых альбо аналагавых. Кіроўца абавязаны даць паказанні гэтага прыбору і ліст пацвярджэння дзейнасці за 28 + адзін дзень, у якім пазначана, колькі ён адпачываў. Картка з лічбавага тахографа ўстаўляецца ў камп'ютар, і счытваецца ўся неабходная інфармацыя. Зразумела, працаваць з імі значна прасцей, але такія прыборы маюць толькі новыя транспартныя сродкі. Большасць кіроўцаў карыстаецца аналагавымі і прад'яўляе тахаграмы, з-за іх формы названыя «шайбамі», — кажа Уладзімір Марцінеўскі. — Каб не ўскладняць працу перавозчыкам і не было скаргаў ад пасажыраў аўтобусаў, якія адбываюць, мы праводзім іх толькі візуальны агляд. Пераконваемся, што няма разбітага лабавога шкла, зносу пратэктараў, рознага малюнка пратэктара колаў адной восі.

Пакуль размаўляем з Уладзімірам Марцінеўскім, яго калега правярае аўтобус, які прыехаў з Украіны. Па словах транспартнікаў, большасць турыстычных рэйсаў з Беларусі адпраўляецца цяпер у напрамку Затокі, Адэсы.

— У гэтага кіроўцы — парушэнне. З 31 ліпеня па 2 жніўня ён не пераводзіў тахограф у рэжым адпачынку. Атрымалася, што мужчына знаходзіўся на рабочым месцы двое сутак, — тлумачыць Вячаслаў Саржыцкі.

Калі на рэйсе працуе экіпаж з двух чалавек (а такіх на міжнародных пасажырскіх перавозках большасць), за 30 гадзін адпачынак павінен быць не менш за дзевяць гадзін. Праз кожныя чатыры з паловай гадзіны ў кіроўцы абавязковы перапынак — 45 хвілін. Пасля шасці перыядаў кіравання па 24 гадзіны ён не можа абысціся без сутачнага адпачынку.

Выявіўшы парушэнне, спецыяліст выпісвае штраф. Кіроўца не супярэчыць: «Правініўся — заплачу!» Пакуль украінец шукае найбліжэйшы банк, працягваем размову.

— Парушэнне рэжыму працы і адпачынку — самая распаўсюджаная памылка кіроўцаў міжнародных рэйсаў. Пры згодзе віноўніка штраф пачынаецца ад пяці базавых велічынь (122 рублі 50 капеек). Для грамадзян Беларусі мы выпісваем пастанаўленне, і штраф можна аплаціць на працягу месяца.

**У сувязі з частымі ДТЗ Транспартная інспекцыя прыняла рашэнне аб правядзенні праверак аўтобусаў, якія перавозяць турыстычныя групы грамадзян Рэспублікі Беларусь на адпачынак. Маніторынг арганізаваны ў пунктах пропуску праз дзяржаўную граніцу, а таксама ў месцах прыбыцця аўтобусаў пасля высадкі пасажыраў. Амаль за месяц праверана 643 аўтобусы, з іх 545 належаць беларускім перавозчыкам і 98 — замежным. Выяўлена 130 фактаў парушэння кіроўцамі рэжыму працы і адпачынку. У тым ліку філіялам Транспартнай інспекцыі па горадзе Мінску і Мінскай вобласці праверана 125 аўтобусаў. Вызначана каля 40 фактаў парушэння кіроўцамі рэжыму працы і адпачынку. Кантрольныя мерапрыемствы працягваюцца.**

Вядучы спецыяліст Уладзімір Марцінеўскі аглядае аўтобус, які накіроўваецца ў падарожжа. Кіроўца хвалюецца: «Няма часу! Усё ў парадку! Тры дні на «адстоі» стаяў».

— «Адстой» на слэнгу кіроўцаў — гэта адпачынак, — тлумачыць супрацоўнік Транспартнай інспекцыі.

— А бываюць выпадкі, калі самі пасажыры скардзяцца на кіроўцаў?

— Звычайна наадварот, абараняюць, бо хочуць хутчэй даехаць на адпачынак. А калі назад вяртаюцца, падчас падарожжа ўжо могуць і сябрамі стаць, таму скаргаў ад іх няма.

Станцыя «Дружная» выбрана пунктам кантролю як самае папулярнае месца адбыцця і вяртання міжнародных аўтобусных маршрутаў (што значна раздражнее кіроўцаў гарадскога камунальнага транспарту). Апошні час канцавым прыпынкам гэта месца з'яўляецца для невялікай колькасці рэйсаў: аб прысутнасці тут транспартнікаў кіроўцы паведамляюць адзін аднаму з дапамогай радыёстанцый. Пасажыраў пачынаюць высаджваць на шляху: каля метро, гандлёвых цэнтраў.

— Але і гэтыя прыпынкі мы ведаем. Можам аператыўна змяніць месца праверкі, — запэўніваюць супрацоўнікі Транспартнай інспекцыі. — За васьмігадзінную змену правяраем ад 10 да 15 аўтобусаў. Калі пачыналі на гэтым пункце працаваць, было больш.

Кіроўца-міжнароднік, які працуе на пасажырскіх рэйсах, павінен мець пасведчанне катэгорыі Д са стажам на аўтобусе М2 (колькасць пасажыраў звыш васьмі і агульнай масай да пяці тон) два гады, М3 (колькасць пасажыраў звыш васьмі і агульнай масай звыш пяці тон) тры гады і дакумент аб заканчэнні курсаў для такіх спецыялістаў.

На стаянцы заўважаю кіроўцу турыстычнага аўтобуса, які павольна ходзіць па пляцоўцы, пытаю:

— Як ставіцеся да калег, якія парушаюць рэжым?

— На дарозе бывае ўсякае, але галоўнае — разумець, што ты адказваеш не толькі за сваё жыццё, але і за жыцці пасажыраў.

— Пападаецеся на парушэннях?

— Калі б пападаўся, то дзяцей бы не перавозіў.

— Гэтыя аўтобусы належаць дзіцячаму цэнтру адпачынку, — падказвае мне вядучы спецыяліст Транспартнай інспекцыі.

Цікаўлюся, што супрацоўнікі ведамства думаюць аб прычынах рэзанансных аварый?

— Падрабязнасцяў не ведаем, таму цяжка канкрэтнае нешта сказаць. Чатыры-пяць гадзін раніцы — вельмі складаны для кіроўцаў час. Яны нярэдка засынаюць. Уначы мы рэкамендуем змяняцца кожныя тры гадзіны. Чалавечы фактар. Мабыць, ехаў, хацеў дацягнуць да канца змены, але...

Прыбывае яшчэ адзін аўтобус. Кіроўца па просьбе прыносіць ужо вядомыя «шайбы» аналагавага тахографа.

— На прыборы ёсць некалькі граф, на якіх пазначаны перыяд кіравання і хуткасць. Транспарт спыняецца — прыбор можа аўтаматычна перайсці ў рэжым адпачынку, ці трэба яго перавесці ўручную. Калі адзін член экіпажа кіруе транспартным сродкам, другі знаходзіцца ў пасіўным рэжыме — на «шайбе» гэта пазначана «канвертам». Калі кіроўца запраўляецца, праходзіць мяжу, ён павінен пераставіць тахограф у рэжым «малаточкаў» — актыўнай працы. Ёсць пасіўная, актыўная праца. Усе гэтыя пазіцыі на тахаграмах адлюстроўваюцца, — тлумачыць прынцып работы прыбора Уладзімір Марцінеўскі.

Тахографамі павінны быць абсталяваны ўсе транспартныя сродкі, якія здзяйсняюць міжнародныя грузавыя (масай звыш 3,5 тоны) і аўтобусныя пасажырскія перавозкі. Згодна з нашым заканадаўствам унутраныя рэйсы могуць не карыстацца такімі прыборамі.

Кантроль аўтатранспарту — толькі адзін з кірункаў работы Транспартнай інспекцыі. Ведамства ажыццяўляе кантроль вагагабарытных, чыгуначнага транспарту, авіяцыйнай бяспекі, кантроль за платнымі дарогамі і выдачу картак лічбавага тахографа кіроўцам і прадпрыемствам.

Спецыялісты сцвярджаюць: «Наша задача — працаваць на папярэджанне, а не на пакаранне парушальнікаў. Нам важна, каб яны ўсвядомілі сваю віну».

Сістэма праверкі і штрафаў распрацавана не для таго, каб кіроўца заплаціў грошы. Галоўнае, каб ён усвядоміў сваю памылку і наступны раз не рызыкаваў ні сваім жыццём, ні жыццямі пасажыраў.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота аўтара.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторного открытого аукциона**

ОАО «СМТ «Белтопливострой» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1:**

– <u>одноэтажное кирпичное здание РБУ</u> общ. пл. **188** кв.м, инв. № **332/С-58930**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000073** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48Б. – 11 918,84 бел. руб.**

– <u>одноэтажное, кирпичное здание мастерских</u> общ. пл. **398,9** кв. м, инв. № **332/С-58936**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000079** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48А/2.– 23 385,16 бел. руб.**

– <u>одноэтажный, шиферный склад для хранения баллонов</u> общ. пл. **18** кв. м, инв. № **332/С-58932**, расположенный на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000079** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48А/7.– 201,98 бел. руб.**

– <u>одноэтажное, дощатое, облицованное кирпичом здание склада № 1</u> общ. пл. **262** кв. м, инв. № **332/С-58934**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000079** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48 А/5.– 11 547,68 бел. руб.**

– <u>одноэтажные кирпичные гаражи</u> общ. пл. **1 164,5** кв. м, инв. № **332/С-58931**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000079** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48А/1. – 25 720,14 бел. руб.**

– <u>одноэтажное кирпичное здание навеса №2</u> общ. пл. **266,4** кв. м, инв. № **332/С-58929**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000079** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48А/3.– 3 829,92 бел. руб.**

– <u>одноэтажное кирпичное здание навеса № 1</u> общ. пл. **197,4** кв. м, инв. № **332/С-58928**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000079** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48А/4.– 350,67 бел. руб.**

– <u>одноэтажное кирпичное здание склада № 2</u> общ. пл. **276,3** кв. м, инв. № **332/С-58925**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000079** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48А/6. – 24 221,22 бел. руб.**

– <u>одноэтажное кирпичное здание проходной</u> общ. пл. **29,7** кв. м, инв. № **332/С-17228**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000079** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48А.– 6 526,26 бел. руб.**

– <u>двухэтажное кирпичное административное здание с ограждением</u> общ. пл. **275** кв. м, инв. № **332/С-58926**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером **321685204601000072** по адресу: **Гомельская область, Житковичский район, Червоненский с/с, п. Червоное, ул. Поселковая, д. 48.– 15 795,01 бел. руб.**

**Итого: начальная цена с НДС по лоту № 1– 123 496,88 бел. руб., задаток 10 % (12 349,68 бел. руб.) от начальной цены.**

Стоимость снижена на 20 % от первоначальной цены объектов недвижимости.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.07.2018.

**Задаток перечисляется на р/с № BY06 AKBB 3012 1091 3001 8530 000, БИК AKBBBY21514, ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал № 514, г. Минск, УНП 100289211, ОКПО 029993446000.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения повторного аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения повторного аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) торгов (покупатель) возмещает затраты, связанные с организацией и проведением повторного аукциона. Повторный аукцион состоится **21.08.2018** в **14.00** по адресу: Минский район, аг. Колодищи, ул. Чкалова, 51, каб. 33. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.08.2018** до **17.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 513-24-09, (8044) 703-92-15.**

# Крывавае ЦАРства

## Што адбываецца ў Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы?



**Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка на мінулым тыдні апынулася ў топе навінавых стужак сусветных інфармагенцтваў. Падстава насамрэч была сумная — у гэтай краіне забілі трох расійскіх журналістаў. Днямі ў Маскве адбылося развітанне з Арханам Джэмалем, Кірылам Радчанкам і Аляксандрам Растаргуевым. Устаноўлена, што журналісты прыбылі ў ЦАР для здымак дакументальнага фільма. Іх аўтамабіль быў абстраляны баевікамі. Згодна з асноўнай версіяй, расіян забілі падчас рабавання — з сабой яны везлі дарагую апаратуру і буйную суму грошай. Злачынства без перабольшвання скаланула ўвесь свет і прыцягнула ўвагу да таго, што адбываецца ў Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы.**

### АЛМАЗНЫ КРАЙ

Рэспубліка, якая знаходзіцца ў цэнтры Афрыканскага кантынента, — адна з самых бедных краін свету. Эксперты розных праваабарончых арганізацый рэгулярна ўключаюць яе ў спісы самых «няўдалых» дзяржаў (разам з Суданам і Рэспублікай Конга) па розных параметрах — ад узроўню карупцыі да стану сістэмы аховы здароўя і эканамічнай сітуацыі.

Пры гэтым на яе тэрыторыі размешчаны буйныя радовішчы золата, урану, вуглевадародаў і, галоўнае, — алмазаў, якія там здабываюць з пачатку мінулага стагоддзя. Да пачатку 2010-х, па звестках Геалагічнай службы ЗША, Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка займала 10-е месца сярод усіх удзельнікаў сусветнага алмазнага рынку па кошце прададзеных камянёў.

Пасля чарговага грамадзянскага канфлікту, які пачаўся ў 2013 годзе, на краіну была накладзена забарона на экспарт алмазаў (яе знялі пазалетась), аднак іх незаконная здабыча працягнулася. Па некаторых звестках, менавіта даходы ад яе выкарыстоўваліся для фінансавання баявых дзеянняў. Зараз, згодна з выкладзенымі ў грамадскі доступ данымі ЦРУ, аснову легальнай эканомікі краіны складае экспарт каштоўных камянёў і каштоўных парод драўніны. Насельніцтва краіны, паводле ацэнак Сусветнага банка, складае каля 4,7 млн чалавек, паводле ацэнак ЦРУ — 5,6 млн. У любым выпадку, гэта адна з самых маланаселеных краін Афрыкі, што робіць яе падчас беспарадкаў практычна некантралюемай. У 2013—2014 гадах, пасля пачатку грамадзянскай вайны, краіну пакінула прыкладна чвэрць жыхароў (больш за 1 млн). Пры гэтым ЦАР — хрысціянская дзяржава. Хрысціяне розных канфесій складаюць каля 80 працэнтаў насельніцтва, на долю мусульман прыходзіцца 15 працэнтаў.

### НА АСКЕПКАХ «ІМПЕРЫІ»

Адна з галоўных тэрытарыяльных праблем Цэнтральнаафрыканскай Рэспублікі, якая мяжуе, у тым ліку, з Суданам, Конга, Камерунам і Чадам, — адсутнасць прамога выхаду да мора. Затое гістарычна праз гэтыя землі пралягаў караванны шлях на Блізкі Усход, якім карысталіся гандляры слановай косцю і нявольнікамі. Менавіта прадстаўнікоў плямёнаў, якія засялялі тэрыторыю сучаснай ЦАР, па гэтым шляху доўгі час зганялі ў рабства жыхары суседняга Дарфура.

Калі напрыканцы XIX стагоддзя пачалася каланізацыя афрыканскіх тэрыторый, землі сучаснай ЦАР апынуліся на скрыжаванні інтарэсаў адразу некалькіх буйных каланіяльных дзяржаў — Брытаніі, Францыі і Германіі, што ў XIX стагоддзі ледзь не прывяло да канфлікту паміж Брытаніяй і Францыяй. У выніку, будучая рэспубліка засталася пад кантролем Францыі.

Менавіта французскія каланізатары ў 1920—1930-я адкрылі і пачалі асвойваць алмазныя радовішчы, якія знаходзіліся тут. Перад гэтым ім прыйшлося ўтаймаваць цэлую серыю паўстанняў, якія адбываліся на падкантрольных тэрыторыях з пачатку XX стагоддзя, часам даволі жорсткімі метадамі — лічыцца, што насельніцтва некаторых раёнаў рэспублікі пасля гэтага магло скарачыцца амаль на 80 працэнтаў.

Незалежнасць ЦАР здабыла ўжо ў 1960-я. Назадоўга да гэтага загінуў першы прэзідэнт краіны Бартэлемі Баганда, які кіраваў краінай з пасляваеннага часу. Першым кіраўніком ужо незалежнай дзяржавы стаў Давід Дако, але правіў ён нядоўга — у 1966 годзе ў выніку ваеннага перавароту яго зверг начальнік штаба арміі рэспублікі Жан-Бедэль Бакаса. Ён стаў адным з самых вядомых палітыкаў краіны. Бакаса абвясціў рэспубліку Цэнтральнаафрыканскай імперыяй, а сябе — пажыццёвым імператарам, які праславіўся пры гэтым любоўю да раскошы і крайняй эксцэнтрычнасцю. Як паведамлялі СМІ, пасля звяржэння ў халадзільных камерах у яго палацы знайшлі фрагменты чалавечых цел. Бакасу абвінавацілі ў канібалізме, але гэтыя абвінавачванні так і не змаглі даказаць.

«Імператар» кіраваў ЦАР каля дзесяці гадоў, пры гэтым за час яго праўлення карупцыя ў краіне дасягнула рэкорднага ўзроўню, а вось эканамічная сітуацыя, наадварот, рэзка пагоршылася. У рэшце рэшт у сітуацыю ўмяшалася Францыя — у выніку праведзенай французскімі дэсантнікамі аперацыі Бакаса быў звергнуты, «вакантнае месца» зноў заняў Давід Дако. Пасля адбылася доўгая чарада дзяржаўных пераваротаў.



### «СЕЛЕКА» І «АНТЫБАЛАКА»

Адносны мір у рэспубліцы ўсталяваўся толькі ў 1990-я гады, але ўжо ў 2003-м, пасля чарговага «путчу», да ўлады прыйшоў генерал Франсуа Базізэ, які раней займаў у краіне некалькі міністэрскіх пасад. У 2013 годзе на тэрыторыю ЦАР уварваліся атрады паўстанцкай мусульманскай арганізацыі «Селека» (на мове санг гэта азначае «кааліцыя»). У розны час паведамлялася, што падтрымку ім маглі аказваць, у тым ліку, Судан, Сірыя і нават, па некаторых звестках, Францыя, але афіцыйнага пацвярджэння гэтай інфармацыі няма. У кароткія тэрміны «Селека» ўсталявала кантроль над большай часткай тэрыторыі краіны, а таксама над пэўнай колькасцю алмазных радовішчаў.



У адказ хрысціяне сфармавалі апалчэнскія атрады «Антыбалака», якія дзейнічалі адначасова з урадавымі войскамі. У краіне пачаўся кровапралітны рэлігійны канфлікт. Літаральна слова «антыбалака» перакладаецца з мовы санг як «супраць мяча». На слэнгу ж слова «лаку» выкарыстоўваюць для абазначэння АК-47, таму чынам у сваёй назве хрысціянскія паўстанцы адлюстравалі сваё жаданне спыняць кулі ад аўтаматаў Калашнікава, якімі былі ўзброены байцы «Селекі». Аднак міралюбнасці ў гэтых хрысціянах не так ужо і шмат. Аб жорсткасці баевікоў «Антыбалакі» неаднаразова паведамлялі не толькі СМІ, але і міжнародныя арганізацыі, якія дзейнічаюць у краіне, у тым ліку ААН. Адзін з найбольш «папулярных» сярод баевікоў групоўкі спосабаў расправы з сапернікамі з'яўляецца спальванне жыўцом.

Як расказаў mk.ru намеснік дырэктара Цэнтра аналізу сусветнага гандлю зброяй Уладзімір Швараў, вялікага і цэнтралізаванага рынку ўзбраенняў у ЦАР няма. «Там вельмі шмат «шэрай» зброі, — тлумачыць эксперт. — Існуюць і так званыя ўзаемныя пастаўкі, калі бакі, якія супрацьстаяць, могуць нешта прадаваць адзін аднаму. Трэція краіны таксама могуць гандляваць зброяй, але толькі праз пасярэднікаў». Па словах Шварава, у праўрадавых сіл ЦАР ёсць невялікая колькасць французскіх бранявікоў, некалькі верталётаў, таксама французскіх, лёгкае стралковае ўзбраенне і кулямёты. У паўстанцаў рознай масці — сучэльная зборная «салянка». Аднак, як звычайна, у бой яны ідуць з нязменнай класікай — аўтаматам Калашнікава або з кулямётам таго ж вытворцы.

Ужо ў 2013 годзе Базізэ быў звернуты са сваёй пасады. Сталіца краіны Бангі аказалася практычна пазбаўленая электрычнасці, водазабеспячэння, спыніла работу вялікая частка дзяржаўных устаноў, у тым ліку медыцынскіх. Для стабілізацыі сітуацыі ў ЦАР увайшлі войскі Францыі. Пазней яны перадалі свае паўнамоцтвы міратворчай місіі ААН, якая па большай частцы складалася з французскіх жа міратворцаў. Пасля падзення Базізэ на кароткі час кіраўніком стырна апынуўся Мішэль Джатодыя — лідар «Селекі», мусульманін, пры гэтым у юнацтве ён каля 10 гадоў пражыў у СССР, дзе скончыў тэхнікум у Арле і Універсітэт дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы. Акрамя таго, ён быў жанаты з жанчынай з Савецкага Саюза, якая нарадзіла ад яго дачку. Пасля вяртання ў ЦАР Джатодыя працаваў у падатковай службе. Ён узначальваў краіну менш за год — з сакавіка 2013-га да студзеня 2014-га. Але ў выніку, практычна цалкам страціўшы кантроль над тым, што адбываецца, збег у Бенін. Яго адстаўку, на фоне шматтысячных акцый пратэсту, якія праходзілі ў Бангі, прымалі ўдзельнікі Эканамічнага саміту краін Цэнтральнай Афрыкі, што праводзіўся ў гэты час у Чадзе, дзе тады знаходзіўся Джатодыя.

### ЛЕПШ АБ'ЕХАЦЬ

Як сцвярджаюць эксперты, у Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы не тое што падарожнічаць, нават да межаў гэтай краіны наблізацца небяспечна. Сёння ЦАР не проста ахопленая грамадзянскай вайной рэспубліка. Тут пражывае каля 80 этнічных груп, у кожнай з якіх свая мова. З-за рэлігійнага напружання па лініі мусульмане — хрысціяне ЦАР пагрузілася ў стан вайны «ўсе супраць усіх».

Афіцыйны ўрад краіны, якая па плошчы супастаўная з Францыяй, кантралюе толькі сталіцу Бангі (а па паведамленнях шматлікіх карэспандэнтаў і міжнародных арганізацый, якія дзейнічаюць у краіне, — толькі асобныя яе раёны). Краіна па сутнасці з'яўляецца закладніцай больш чым 10 розных узброеных груповак, якія змагаюцца паміж сабой за ўладу і рэсурсы. «Некаторыя групоўкі знаходзяцца паміж сабой у саюзе, некаторыя ваююць адна з адной, часам баявыя дзеянні вядуць асобныя фракцыі груповак. Перыядычна падпісваюцца пагадненні аб спыненні агню, якія вельмі хутка парушаюцца, — паведаміў прафесар расійскай Вышэйшай школы эканомікі Іван Крывушын. — Фактычна краіна падзелена на феадальныя ўладанні лідараў узброеных груповак, тэрыторыі якіх пастаянна змяняюцца. Межы гэтых вызначаюцца блокпастамі, а ўнутры сваёй тэрыторыі кожная групоўка самавольна збірае падаткі і пошліны, а таксама атрымлівае немалыя прыбыткі ад незаконнага гандлю золатам, дыяментамі, жалезнай рудой, кавай і драўнінай».

Як паведаміла газета The Guardian, большая частка насельніцтва пакутуе ад голаду, а колькасць жыхароў, вымушаных пакінуць свае дамы і перасяліцца ў іншыя раёны ўнутры краіны, летась дасягнула 689 тысяч чалавек. Дзеючы прэзідэнт краіны Фостэн-Арканж Туадэра чарговы раз выказаў занепакоенасць у сувязі з сутыкненнямі паміж хрысціянскімі і мусульманскімі атрадамі. У той жа час замежныя СМІ пачалі пісаць пра новы віток «бітвы за Афрыку» і яе рэсурсы на сусветным узроўні.

«Ёсць такое паняцце — рэсурсавы праклён, якое моцна праяўляецца ў Афрыцы. У Анголе 35 гадоў ішла вайна, шмат у чым справакаваная барацьбой за нафту і алмазы. «Алмазнымі» былі жорсткія грамадзянскія войны ў Ліберыі і Сьера-Леоне. ЦАР вельмі багатая на прыродныя рэсурсы, але галоўнае, што там сёння цэніцца, — багатыя паклады ўрану», — расказаў gazeta.ru намеснік дырэктара Інстытута Афрыкі РАН Дзмітрый Бандарэнка.

Завалодаць і кантраляваць радовішчы каштоўных рэсурсаў у ЦАР імкнуцца не толькі ўзброеныя бандфарміраванні, але і іншыя краіны. «Да апошняга часу краіна знаходзілася ў арбіце палітыкі Францыі, якая захоўвае там ваенную базу і, вядома, імкнецца да кантролю над гэтымі рэсурсамі. Аднак цяпер у гэтым рэгіёне свае інтарэсы спрабуюць зацвердзіць і амерыканцы, і кітайцы, і, маркуючы па падзеях апошняга года, — Расія», — сцвярджае эксперт. Палітычная стабільнасць, сацыяльны і эканамічны рост рэспублікі ў цэнтры Чорнага кантынента па-ранейшаму застаюцца няспраўджанымі марамі.

**Захар БУРАК.**

# ВА ЎСІМ СВЕЦЕ ВЕДАЮЦЬ, ШТО ТАКОЕ КАРАТЭ

## Гэты від спорту ўпершыню будзе прадстаўлены на Еўрапейскіх гульнях у Мінску і на Алімпіядзе ў Токіа



**У алімпійскую праграму 2020 года МАК уключыў пяць новых відаў спорту — бейсбол (софтбол), каратэ, сёрфінг, спартыўнае скалалажанне і скейтбордынг. Галоўнай прычынай іх з'яўлення ў праграме з'яўляецца папулярнасць сярод спартыўнай грамадскасці і масавасць. Сёння больш падрабязна мы пагаворым аб каратэ, таму што яно будзе прадстаўлена на II Еўрапейскіх гульнях у Мінску, гэты турнір стане своеасаблівай рэпетыцыяй перад Алімпійскімі гульнямі ў Токіа. Пра тое, як від спорту развіваецца ў нашай краіне і хто прадстаўляе Беларусь на топ-турнірах, расказалі старшы трэнер нацыянальнай каманды Анатоль КУР'ЯНОВІЧ *(на фота)* і генеральны сакратар Беларускай федэрацыі каратэ Дзмітрый БУРЫНСКІ.**

Шлях каратэ да Алімпійскіх гульняў быў доўгі і не сказаць, што лёгкі, ён пачаўся з 1999 года, калі від спорту канчаткова прызнаў Міжнародны алімпійскі камітэт. Каб трапіць у праграму Гульняў, неабходна выканаць сотні патрабаванняў алімпійскай хартыі, у каратэ гэта атрымалася толькі ў 2016 годзе. Вялікі ўплыў на МАК аказала тое, што гэты від спорту неверагодна папулярны ў свеце, каратэ развіваецца на ўсіх кантынентах. Напрыклад, на апошніх чэмпіянатах свету ў Францыі, Германіі і Аўстрыі спаборніцтвы абавязкова праходзілі на 15-тысячных арэнах, і ўсе яны збіралі аншлагі. «Калі вы бачылі, запоўненую «Мінск-Арэну», то ўяўляеце, што адбывалася там, — расказвае старшы трэнер нацыянальнай зборнай Беларусі па каратэ Анатоль Кур'яновіч. — Квіткі на турнір былі раскуплены за два тыдні да старту, кошт у перакупаў даходзіў да 150 еўра, хоць у касах білеты можна было набыць за восем еўра. Падчас спаборніцтваў гледачы сядзелі нават на прыступках».

У Еўропе найбольш паспяховыя краіны ў гэтым відзе спорту — Францыя, Італія, Іспанія і Турцыя, у Азіі — Іран, Японія і Малайзія, добра развіты ён таксама ў Аўстраліі, Бразіліі і ЗША. У чэмпіянаце свету па каратэ звычайна прымаюць удзел прадстаўнікі 100 краін, на чэмпіянаце Еўропы — 50.

Калі казаць пра саміх спартсменаў, то трапіць на турнір прэм'ер-лігі (спаборніцтвы вышэйшага ўзроўню) не так проста. У іх могуць прымаць удзел толькі 64 спартсмены, у турнірах узроўню ніжэй — серыі А, колькасць атлетаў не абмяжоўваная. «Ды і ў Беларусі каратэ — гэта досыць папулярны від спорту, — расказвае генеральны сакратар федэрацыі Дзмітрый Бурынскі. — Апошні чэмпіянат краіны прайшоў пры поўных трыбунах. Важна, што каратэ развіваецца ў ўсіх абласцях, нават у такіх невялікіх кутках, як Узда, Вілейка, Іўе, Лагойск».

На Алімпійскіх гульнях спартсмены выступаюць у трох катэгорыях: у кумітэ ў жанчын і мужчын, а таксама ў ката. Каб адабрацца на Гульні, каратыстам трэба быць як мага вышэй у сусветным рэйтынгу, а ён фарміруецца на працягу двух гадоў. «У цяперашні час у топ-50 сусветнага рэйтынга ўваходзяць шэсць беларускіх спартсменаў, у сотню — 10 атлетаў. Гэта значыць, у нас добрыя перспектывы і ёсць шанцы адабрацца на Алімпіяду, — адзначае Дзмітрый Бурынскі. — Касцяк зборнай складаюць маладыя каратысты, гэта людзі, якія пачалі паказваць вынікі два-тры гады таму, учарашнія юніёры, якія ўжо зарэкамендавалі сябе добрымі выступленнямі на чэмпіянаце і Кубку Еўропы сярод моладзі. Гэта сведчыць аб станоўчай дынаміцы развіцця. Мы не проста спадзяёмся на добры вынік, а ўсё робім для таго, каб спартсмены змаглі заваяваць ліцэнзіі на Алімпіяду, хоць разумеем, гэта вельмі няпроста, таму што больш за 180 краін удзельнічаюць у гэтым працэсе».

* * *

У Беларусі каратэ таксама папулярнае, хоць нашы турніры пакуль і не збіраюць настолькі вялікай аўдыторыі. Згодна з каляндарным планам, штогод праводзіцца чэмпіянат рэспублікі, кубак, першынство краіны і іншыя турніры, усяго іх каля 15. Спаборніцтвы лакалізіруюцца не толькі ў сталіцы, але і ў абласных гарадах. «Турніры праходзяць практычна кожны тыдзень, бывае нават так, што ў адны выхадныя ў розных месцах праводзяцца буйныя спаборніцтвы і ўсюды збіраюць аншлагі (ад 400 да 600 удзельнікаў), — падкрэслівае Дзмітрый Бурынскі.

Адметна і тое, што каратэ ў адрозненне ад іншых відаў спорту ў краіне, сёння не адчувае праблем з трэнерскімі кадрамі. «У нас за мяжу ніхто не з'язджае, хоць запрашэнняў было шмат, — з гонарам расказвае старшы трэнер нацыянальнай каманды. — Акрамя таго, у дзяцей гэты від спорту папулярны, таму мы пастаянна праводзім работу па адкрыцці аддзяленняў каратэ ў спецыялізаваных спартыўных установах».





* * *

Уключэнне каратэ ў праграму Еўрапейскіх гульняў таксама можна лічыць пэўным крокам у развіцці. Дзмітрый Бурынскі адзначае, што для гэтага кіраўнікамі Беларускай федэрацыі праводзілася вялікая работа на еўрапейскіх і сусветных кангрэсах, рабочых сустрэчах.

На II Еўрапейскіх гульнях спаборніцтвы пройдуць у шасці жаночых і шасці мужчынскіх катэгорыях, па восем спартсменаў у кожнай, гэта значыць усяго ў іх возьмуць удзел 96 каратыстаў з Еўропы. Беларусы атрымліваюць пуцёўкі на правах гаспадароў, астатнія адбіраюцца на турнір паводле рэйтынга. Дарэчы, паспяховае выступленне на Еўрапейскіх гульнях дазволіць спартсменам набраць кваліфікацыйныя балы для таго, каб трапіць на Алімпіяду-2020.

Падрыхтоўка беларускай зборнай да мультыспартыўнага форуму пачалася ўжо даўно, аднак трэнерскі штаб пакуль не спяшаецца ўдзел у ім. «Ёсць аб'ектыўныя фактары, якія могуць змяніць планы спартсменаў — гэта стан здароўя, траўмы, ды і проста спартыўная форма, у якой спартсмен падыдзе да спаборніцтваў. Круг кандыдатаў пастаянна звужаецца. Еўрапейскія гульні — гэта дадатковая магчымасць для спартсменаў сябе праявіць, а нам гэта дапаможа вызначыцца з імёнамі атлетаў, якія будуць змагацца за алімпійскія ліцэнзіі», — адзначае Анатоль Кур'яновіч.

Спаборніцтвы па каратэ на Еўрапейскіх гульнях — 2019 будуць праходзіць у «Чыжоўка-Арэне». З 28 да 30 верасня гэтага года там пройдзе тэставы турнір, у спартсменаў будзе магчымасць апрабаваць пляцоўку, а ўарганізатараў зразумець усе нюансы арэны і ў чэрвені наступнага года зрабіць спаборніцтвы сапраўдным святам.

**Каратэ доўгі час з'яўлялася адным з відаў спорту — кандыдатаў на ўключэнне ў праграму Алімпійскіх гульняў. Адной з перашкод на шляху да статусу алімпійскага віду спорту з'яўляўся высокі траўматызм спартсменаў і наяўнасць велізарнай колькасці стыляў і федэрацый каратэ, якія не імкнуліся да якой-небудзь спартыўнай уніфікацыі, неабходнай для таго, каб стаць алімпійскім відам спорту.**

# ГЭТА БЫЛО ФЕЕРЫЧНА!



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*«А я казаў перад матчам, што «Зеніт» выйграе. Дурань стары! Зразумела, што матч будзе цяжкі, але такога я не чакаў»,* — каменtуе гульню, мабыць, самы вядомы балельшчык «Зеніта» **народны артыст Расіі Міхаіл БАЯРСКІ.** — *Кашмар які! Бедны Сярожа Сямак! Гэта жудасна. Каманда не ў форме і выйшла гуляць без баявога духу. Так падвесці трэнера! Ну, як так можна? Гэта вельмі не па-мужчынску пасля чэмпіянату свету так прайграць не самай моцнай камандзе. Хоць у мінскага «Дынама» добрая каманда, але 0:4! Я вельмі засмучаны»,* — заявіў Баярскі.

Варта адзначыць і іншых піцерскіх балельшчыкаў, якія ў такой вялізнай колькасці прыехалі ў Мінск. Яны былі гучнымі, эмацыянальнымі і яркімі, за дзве гадзіны да матча зладзілі арганізаваны праход па цэнтры сталіцы, а падчас гульні, нягледзячы на лік на табло, не змаўкалі, спявалі песні і заводзячы фанацкія крычалкі. Зрэшты, не абышлося без здарэнняў, піцерцы ўчынілі бойку на сектары самі паміж сабой, балазе гэта ніяк не паўплывала на саму гульню.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Галоўны трэнер мінскага «Дынама» Сяргей ГУРЭНКА** адзначыў, што гэты матч — толькі палова справы яго падапечных. *«Аб'ектыўна ацэньваю каманды, мы не маглі за кошт майстэрства абыграць «Зеніт», аднак за кошт гульнявой дысцыпліны дамагліся выніку. Мае падапечныя гарэлі жаданнем удала згуляць з камандай з Санкт-Пецярбурга, і ў іх гэта атрымалася. Хачу перасцерагчы гульцоў і балельшчыкаў ад эйфарыі. Наперадзе матч у адказ з «Зенітам» у Санкт-Пецярбургу. І ў гасцях неабходна выстаяць 90 хвілін»,* — адзначыў трэнер.

**Сапраўды, упадаць у эйфарыю рана, бо футбол ведае нямала крутых камбэкаў. Напрыклад...**

* У розыгрышы Лігі чэмпіёнаў сезона 2016/2017 матч паміж ПСЖ і «Барселонай» скончыўся з вынікам 4:0, а праз тыдзень «Барса» здзейсніла камбэк 6:1.

* Кажуць, самай вар'яцкай гульнёй у Бундэслізе стала сустрэча «Бохума» і «Баварыі» ў 1976 годзе. На 53-й хвіліне лік быў 4:0 на карысць «Бохума», а з 54-й да 76-й хвіліны матча «Баварыя» забіла пяць!!! мячоў, яшчэ праз чатыры хвіліны на табло загарэліся лічбы 5:5, а затым за хвіліну да фінальнага свістка Улі Хёнэс усё ж такі вырваў перамогу для «Баварыі».

У чацвер завяршыўся яшчэ адзін матч з удзелам беларускага клуба. Футбалісты брэсцкага «Дынама» саступілі кіпрскаму «Апалону» 0:4. Сустрэчы ў адказ 3-га раўнда Лігі Еўропы адбудуцца праз тыдзень — 16 жніўня.

Нагадаем, раней футбалісты БАТЭ ў выязным матчы кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў атрымалі перамогу над «Карабахам» з лікам 1:0. Іх гульня ў адказ адбудзецца на «Барысаў-Арэне» 14 жніўня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»**
220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18

# ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА (ПРЕДЛОЖЕНИЕ)
## на заключение договора срочного безотзывного банковского вклада в иностранной валюте «Интернет-депозит – Тренд Безотзывный»

Настоящий документ, размещенный в сети интернет на веб-сайте по адресу: www.asb.by Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк», именуемым в дальнейшем «Вкладополучатель», является публичной офертой, то есть предложением Вкладополучателя заключить договор срочного безотзывного банковского вклада (в _________[1]) (далее – Договор) с физическим лицом, являющимся владельцем текущего (расчетного) банковского счета, доступ к которому может быть обеспечен при использовании дебетовой банковской платежной карточки (далее – карточка), оформленной на его имя, именуемым в дальнейшем «Вкладчик».

Текущий (расчетный) банковский счет, доступ к которому может быть обеспечен при использовании карточки Вкладчика (далее – текущий счет), должен быть открыт в (__________[1]) в одном из подразделений Вкладополучателя.

Вкладополучатель считает себя на условиях, указанных в настоящем предложении, заключившим Договор с Вкладчиком, который при соблюдении условий настоящего предложения и в порядке, им предусмотренном, отзовется на настоящее предложение (акцептует предложение).

Договор считается заключенным между Вкладополучателем и Вкладчиком в момент акцепта Вкладчиком публичной оферты Вкладополучателя.

Акцептом публичной оферты – заключением настоящего Договора на изложенных далее условиях является совершение Вкладчиком в системах дистанционного банковского обслуживания Вкладополучателя (далее – системы ДБО): системе «Интернет-банкинг» Вкладополучателя (далее – система «Интернет-банкинг») с использованием реквизитов карточки либо в инфокиоске Вкладополучателя[2] (далее – инфокиоск) с использованием карточки операции по переводу с текущего счета суммы первоначального взноса для зачисления на вкладной счет, открываемый согласно настоящему Договору.

Вкладополучатель размещает Договор в сети интернет на веб-сайте по адресу: www.asb.by и в системах ДБО, определенных Вкладополучателем.

Для совершения акцепта в системе «Интернет-банкинг» карточка должна быть зарегистрирована в системе «Интернет-банкинг» Вкладополучателя, в инфокиоске – регистрация карточки не требуется.

Размер первоначального взноса на вкладной счет определяется Вкладчиком самостоятельно с учетом требований подпункта 2.2.2 настоящего Договора и указывается в документе, формируемом в системе ДБО по факту совершения данной операции в подтверждение ее совершения.

1. ПРЕДМЕТ ДОГОВОРА

1.1. По настоящему Договору Вкладополучатель принимает (_______________[3]) – вклад, переведенные Вкладчиком с текущего счета в системе «Интернет-банкинг» с использованием реквизитов карточки либо в инфокиоске[4] с использованием карточки, и обязуется возвратить сумму вклада в соответствии с настоящим Договором, а также в порядке и на условиях, определенных настоящим Договором, выплатить начисленные по вкладу проценты.

1.2. Срок возврата вклада – день истечения ______[5] месяцев со дня акцепта настоящей публичной оферты.

1.3. В рамках настоящего Договора используются следующие термины:

вкладной счет – счет, открытый Вкладополучателем Вкладчику для учета денежных средств, привлеченных во вклад;

зачисление – увеличение остатка денежных средств на вкладном (текущем) счете. Зачисление производится не позднее двух рабочих дней, начиная с первого рабочего дня, следующего за днем перевода (списания);

перевод – совершение в системе «Интернет-банкинг» либо в инфокиоске операции по переводу с текущего счета суммы денежных средств для зачисления на вкладной счет;

пониженная процентная ставка – ставка вклада до востребования в иностранной валюте для физических лиц;

списание – уменьшение суммы денежных средств, доступных на вкладе для распоряжения Вкладчиком.

1.4. В связи с тем, что день перевода (списания) и день зачисления денежных средств на вкладной (текущий) счет Вкладчика могут не совпадать, Вкладчик проинформирован и согласен, что до момента зачисления денежных средств на вкладной (текущий) счет возможность совершения операций в указанный период времени с данными денежными средствами может быть ограничена.

1.5. Вид договора: договор срочного безотзывного банковского вклада.

2. ПРАВА И ОБЯЗАННОСТИ СТОРОН

2.1. Вкладополучатель обязуется:

2.1.1. обеспечить сохранность вклада, своевременность исполнения своих обязательств по Договору и банковскую тайну Вкладчика;

2.1.2. списать сумму вклада в день наступления срока возврата вклада для зачисления на текущий счет.

Если день наступления срока возврата вклада приходится на выходной или праздничный день, то датой наступления срока возврата вклада считается первый рабочий день, следующий за выходным или праздничным днем. В этом случае:

проценты по вкладу за вышеуказанные дни начисляются по ставке, действовавшей по вкладу в последний день, предшествующий дню наступления срока возврата вклада;

выплата процентов путем присоединения к остатку вклада (с последующим в этот же день списанием с вкладного счета для зачисления на текущий счет) производится в первый рабочий день, следующий за выходным или праздничным днем.

Зачисление на текущий счет суммы вклада при наступлении срока его возврата осуществляется в сроки, определенные пунктом 1.3 настоящего Договора;

2.1.3. оказывать услуги по вкладу, установленные Вкладополучателем;

2.1.4. по факту акцепта публичной оферты сформировать в системе ДБО документ, подтверждающий заключение настоящего Договора;

2.1.5. в случае наступления срока возврата вклада и (или) уплаты процентов по вкладу и неисполнения Вкладополучателем данных обязательств в сроки, установленные Договором, Вкладополучатель обязан уплатить штраф в размере 1/2 (одной второй) базовой величины, определенной в соответствии с законодательством Республики Беларусь на день выплаты штрафа, и возвратить указанные денежные средства в срок не позднее 1 (одного) рабочего дня с момента предъявления данного требования.

Возврат суммы вклада, суммы процентов в вышеуказанных случаях осуществляется путем зачисления указанных денежных средств на текущий счет Вкладчика.

Выплата суммы штрафа осуществляется на основании письменного заявления Вкладчика, оформленного в произвольной форме в подразделении Вкладополучателя, в белорусских рублях не позднее пятнадцати календарных дней с даты подачи заявления. Порядок выплаты суммы штрафа определяется Вкладчиком путем указания в заявлении номера счета, на который нужно ее перечислить, либо выдать наличными деньгами.

2.2. Вкладчик обязуется:

2.2.1. оплачивать услуги, оказываемые Вкладополучателем в соответствии с подпунктом 2.1.3 настоящего Договора, в размере, определенном Вкладополучателем, в момент оказания соответствующей услуги;

2.2.2. перечислять денежные средства на вкладной счет с учетом требований к размеру минимальной суммы первоначального взноса и минимальной суммы единовременного дополнительного взноса во вклад, которые устанавливаются Вкладополучателем и указываются в системе ДБО;

2.2.3. не предпринимать действий, направленных на закрытие текущего счета, до дня наступления срока возврата вклада;

2.2.4. возвратить сумму излишне зачисленных на текущий счет денежных средств в случае, если такая переплата произошла в результате нарушения условий Договора из-за технического сбоя и некорректной работы программного обеспечения.

2.3. Вкладополучатель имеет право:

2.3.1. не оказывать Вкладчику услугу по вкладу до момента ее оплаты.

2.4. Вкладчик имеет право:

2.4.1. удостоверить распечатанный документ, сформированный в системе ДБО по факту акцепта публичной оферты (заключения настоящего Договора), в подразделении Вкладополучателя, определенном Вкладополучателем. Документ удостоверяется путем проставления печати подразделения Вкладополучателя, подписи уполномоченного работника Вкладополучателя с указанием должности, ФИО и даты удостоверения документа;

2.4.2. ежемесячно получать проценты по вкладу в соответствии с пунктом 3.3 настоящего Договора.

3. ПРОЦЕНТЫ ПО ВКЛАДУ

3.1. Проценты по вкладу на момент заключения настоящего Договора начисляются исходя из процентной ставки (в процентах годовых) в размере, установленном уполномоченным органом Вкладополучателя и действующем по вкладу на момент заключения настоящего Договора.

Размер процентной ставки (в процентах годовых) указывается Вкладополучателем на официальном веб-сайте Вкладополучателя в сети интернет (www.asb.by). Размер процентной ставки (в процентах годовых), действующий на момент заключения настоящего Договора, также указывается Вкладополучателем в документе, формируемом в системе ДБО по факту акцепта публичной оферты (заключения настоящего Договора).

3.2. Размер процентной ставки может изменяться Вкладополучателем в одностороннем порядке после предварительного уведомления Вкладчика путем размещения объявлений на информационных стендах Вкладополучателя, размещения информации на официальном веб-сайте Вкладополучателя в сети интернет (www.asb.by) и опубликования в газете «Звязда». Днем предварительного уведомления считается день опубликования в вышеназванной газете. В случае уменьшения Вкладополучателем в одностороннем порядке указанной ставки новый размер применяется к вкладу по истечении одного месяца со дня уведомления. В случае увеличения Вкладополучателем размера указанной ставки новый размер применяется к вкладу со дня принятия решения уполномоченного органа Вкладополучателя, если иной день не указан в данном решении.

